РЭВАКЦЫНАЦЫЯ: ЯК РАБІЦЬ 6

ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ КІНО «ЛІСТАПАДА» 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

4 СНЕЖНЯ 2021 г. СУБОТА № 235 (29604)

КАРАТКА

• Акцыя «Апавяшчальнік у кожны дом» стартуе ў Беларусі 4 снежня.

• Тры заказнікі ў Беларусі стануць больш даступнымі для інвалідаў дзякуючы праекту ў сферы экатурызму.

• Гомельская тубальніца за дасягненні ў барацьбе з COVID-19 стала пераможцам міжнароднай прэміі.

• Кошт білетаў на цягнікі ў Расію будзе залежаць ад запаўняльнасці і даты пакупкі.

• Турыстычны сезон стартаваў у Антарктыдзе.

• Дзед Мароз з 23 снежня запрашае маленькіх мінчан у свой домік у парку Горкага.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:

«Рэгіёны з'яўляюцца адным з ключавых прыярытэтаў у развіцці гэтай пяцігодкі. Вельмі важна на старце пяцігадовага інвестыцыйнага цыкла праводзіць мерапрыемствы з прыцягненнем бізнесменаў і расказваць ім аб нашых перавагах. Яшчэ год таму кіраўнік дзяржавы агучыў формулу інвестыцыйнага развіцця рэгіёнаў. Не менш за адзін вытворчы праект у кожным раёне, як мінімум адзін значны буйны праект у рэгіёне. На гэтай формуле мы сёння выбудоўваем нашу работу па фарміраванні пяцігадовай інвестыцыйнай праграмы. На сёння ў Беларусі створаны план па развіцці вытворчасцяў на агульны кошт інвестпраектаў больш як Br50 млрд. Яны датычацца практычна ўсіх сфер дзейнасці, пачынаючы ад вытворчасці паліўных гранул да вакцын і электрацягнікоў. І гэта толькі камерцыйныя праекты».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Людзі хочуць жыць нармальна, і мы ў любой сітуацыі павінны забяспечыць гэта нармальнае жыццё»

Прэзідэнт правёў нараду па сацыяльна-эканамічным развіцці краіны

З дакладам у Палац Незалежнасці прыйшлі кіраўнікі ўрада, Нацыянальнага банка, аблвыканкамаў, Мінгарвыканкама. Яны расказалі пра работу эканомікі, далі ацэнку вынікам года. Кіраўнікі эканамічнага блока дзяржавы прапанавалі праекты прагнозу, бюджэту і грашова-крэдытнай палітыкі на 2022 год.

Фота БелТА.

ЖЫЦЬ МОЖНА. ТОЛЬКІ ТРЭБА ВАРУШЫЦЦА

Па словах Прэзідэнта, гэта нарада мела тактычны характар, бо праблемы, што на ёй разглядаліся, датычыліся будучага года. За аснову ўзятая стратэгія развіцця краіны, прынятая на апошнім Усебеларускім народным сходзе. Там вызначаны і перспектывы, і канкрэтныя паказчыкі дасягненняў.

Спектр пытанняў, што датычацца сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, вельмі шырокі: ад дасягнутага цяпер, ацэнкі вынікаў бягучага года да мер фінансава-эканамічнай палітыкі, якую Савет Міністраў, Нацыянальны банк прапануюць на наступны год.

СТАР. 2

Вялікі перапынак

«ТЫ Ж МАЛАДЫ, ТАБЕ ГЭТА ТРЭБА?»

Сельскі настаўнік — пра свой свядомы выбар, сям'ю і клуб аматараў вандровак

«А ці далёка ад Верхнядзвінска да Сар'і?» — пацікавіўся ў раённым аддзеле адукацыі выпускнік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, малады гісторык Дзяніс КАЗЛОЎ. І пачуў: «Не, не вельмі далёка, кіламетраў восем...» Пасля заканчэння ВНУ ў хлопца быў свабодны дыплом і некалькі варыянтаў з працаўладкаваннем. Але буйныя гарады яго зусім не вабілі.

Дзяніс КАЗЛОЎ: «Я зрабіў свой выбар на карысць школы».

СТАТУС І АЎТАРЫТЭТ

— Сам я родам з гарадскога пасёлка Лёзна, — расказвае Дзяніс. — Калі вучыўся ва ўніверсітэце, мае аднакурснікі з сельскай мясцовасці чамусьці гэтага факта ў сваёй біяграфіі саромеліся, а я, наадварот, ганарыўся. З Лёзна, між іншым, родам славуты мастак Марк Шагал! Ну ці гэта не крута? А пасля заканчэння вучобы я... даслаў сігнал у космас — вельмі хацелася трапіць у нейкае ціхае месца. Вярнуўся дадому, склаў сумкі і... пачаў чакаць. Вырашыў для сябе, што паеду туды, куды накіруе лёс. І вось на мой «запыт да Сусвету» прыйшоў адказ *(смяецца)*. Знаёмы сказаў, што ў Верхнядзвінску ў яго ёсць старое жыллё. Паехаў з сябрам пацікавіцца: а раптам там патрэбны настаўнік гісторыі? Кажуць, так, патрэбны ў школе ў Сар'і.

СТАР. 5

Спажывец

ТОЕ, ШТО НАС ЗВЯЗВАЕ

ШТО МОЖА ПРАПАНАВАЦЬ ПОШТА Ў ГЛЫБІНЦЫ СУЧАСНАМУ СПАЖЫЎЦУ

Калі вам здаецца, што слова «пошта» сёння выкарыстоўваецца толькі ў спалучэнні са словам «электронная» і што дастаўляюць пошту ў наш час толькі сэрвісы ў сеціве, вы не маеце рацыю. У маленькіх гарадах класічная пошта (з жывою — «хто крайні?», а не электроннай — чаргой) — па-ранейшаму адзін з цэнтраў, вакол якога круціцца жыццё. А ў сельскіх населеных пунктах паштальён, як і дзесяцігоддзі таму, — жаданы госць і носьбіт добрых навін.

Начальнік аддзялення сувязі Асіповічы-5 Ларыса ГРАНАЧ.

— Як бы ні змянялася жыццё, у ім заўсёды знойдзецца месца паштальёнам, — пераканана **начальнік аддзялення сувязі Асіповічы-5 Ларыса ГРАНАЧ**. — Пошта запатрабаваная — яна была, ёсць і будзе.

СТАР. 4

Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2022 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы

ISSN 1990 — 763X

«Людзі хочуць жыць нармальна, і мы ў любой сітуацыі павінны забяспечыць гэта нармальнае жыццё»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«***Наша эканоміка падвяргаецца беспрэцэдэнтнаму па маштабе і глыбіні ціску звонку. Агрэсіўная рыторыка, і не толькі яна, але і дзеянні захоўваюцца. А значыць, трэба правесці дасканалы аналіз мер, якія мы прымаем***. Думаю, што гэта ўжо зроблена. Мы бачым не першы раз гэтыя чарговыя пакеты санкцый. Больш за тое, мы да гэтага рыхтаваліся, як мінімум паўгода», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён паведаміў, што для рашэння праблемы санкцый існуе ва ўрадзе так званы антыкрызісны штаб. Ды і ў цэлым, увесь урад, на думку кіраўніка краіны, павінен займацца гэтымі пытаннямі прынцыпова, дакладна, па-ваеннаму. Прэзідэнт падкрэсліваў, што пакуль краіна здолела захаваць эканамічны рост і не дапусціць пераносу большасці праблем на паўсядзённае жыццё людзей.

«І гэта галоўная задача. ***Якія б ні былі санкцыі, як бы на нас ні сціснулі, што б з намі ні спрабавалі зрабіць, тут мы павінны прымаць такія меры, каб людзі гэтых санкцый не адчулі. Прынамсі, каб гэтыя санкцыі і меры не вызначалі жыццё людзей. Запомніце, гэта галоўнае***», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Вынікі дзесяці месяцаў дэманструюць, што валавы ўнутраны прадукт павялічыўся на 2,4 працэнта, расце прамысловая вытворчасць (на 7 працэнтаў), прычым практычна ва ўсіх яе падгалінах. Больш за 60 працэнтаў прамысловай прадукцыі, што вырабляецца ў краіне, пастаўляецца на экспарт. Пры гэтым у глабальным рэйтынгу па індэксе канкурэнтаздольнасці прамысловасці (па даных ААН) Беларусь займае 46-е месца сярод 152 краін свету.

Гэта пацягнула за сабой, кажа Прэзідэнт, павелічэнне экспарту тавараў і паслуг на 33 працэнты, а ў краіну дадаткова паступіла 8,5 млрд долараў. Склаўся рэкордны станоўчы знешнегандлёвы баланс больш як 2,7 млрд долараў.

Шмат у чым дзякуючы такой узважанай макраэканамічнай палітыцы ў нас нядрэнныя паказчыкі плацежнага балансу, а значыць, устойлівы курс і спакой на фінансавым рынку, падкрэсліў кіраўнік краіны. Стабільна расце сярэдняя заработная плата, якая ў кастрычніку ўшчыльную падышла да 1500 рублёў. Кожны чацвёрты работнік у краіне атрымлівае заработную плату большую за гэты ўзровень, тады як год таму іх доля складала толькі 16 працэнтаў.

«Мы не павінны думаць, што вырашылі ўсе праблемы. Тут напружаная праца дзяржаўнага апарату, усяго народа і збег абставін. Дзесьці нам і пашчасціла — і ў пандэмію мінулага года мы выбралі свой беларускі шлях. Не закрываліся. Не крычалі. Проста працавалі, — адзначыў Прэзідэнт і дадаў: — Павінен заўважыць, ***што беларускім шляхам у 2021 годзе пайшоў увесь свет***. Гэтага ніхто не скажа, бо Беларусь не Амерыка. Калі б у амерыканцаў так было, ужо б трубілі на ўвесь свет. ***Нас за гэта не пахваляць, а наадварот, будуць за гэта душыць. Праблем нямала, і, на жаль, на 90 працэнтаў гэтыя праблемы прынесены звонку***».

ЦЭНЫ І ІНФЛЯЦЫЯ

Па словах Прэзідэнта, негатыўныя тэндэнцыі, якія яго вельмі непакояць, датычацца перш за ўсё цэн. Упершыню за некалькі гадоў інфляцыя перавысіла прагнознае значэнне.

«Цэны на сацыяльна значныя тавары ў сярэднім выраслі амаль на сем працэнтаў, і гэтая тэндэнцыя не пераломленая. А па некаторых таварах першай неабходнасці зафіксавана павышэнне ад 10 да 100 працэнтаў. Пры гэтым вытворцы сацыяльна значных тавараў і суб'екты гандлю знайшлі шчыліны, якія дазваляюць абыходзіць уведзеныя цэнавыя абмежаванні і павышаць цэны», — кажа Аляксандр Лукашэнка.

У гэтай сувязі ён папрасіў прэм'ер-міністра і старшыню Праўлення Нацыянальнага банка асабліва спыніцца ў дакладах на гэтым пытанні. Прэзідэнт згадвае, што часткова інфляцыя кшталту «заразы» ўнесеная звонку — на сусветным рынку ўсё даражэе. Адкрытая беларуская эканоміка закупляе там і метал, і жалеза, і іншую сыравіну па высокіх цэнах.

«Я ўжо казаў. Падчас пандэміі не працавалі, а друкарскія станкі круціліся. Долараў і еўра надрукавалі — дзяваць няма куды. Пайшла інфляцыя. Яна занесеная звонку, ніхто не адмаўляе. Але самасупакойвацца і казаць, што падаражэла і ў Амерыцы, і ў Расіі, і ў Кітаі, таму і ў нас, — не трэба спасылак толькі на гэта фактар. Фактараў гэтага павышэння цэн у краіне шмат», — заявіў Прэзідэнт.

Ён заўважыў, што нельга дапусціць, каб цэнавыя фактары пераходзілі ў наступны год.

УПУСКАЦЬ МОМАНТ НЕЛЬГА

Савет Міністраў мяркуе, што ў наступным годзе ў прыярытэт трэба ўзвесці экспарт. Пакуль ёсць магчымасць прадаваць і замацоўвацца на сусветных рынках — трэба дзейнічаць.

«Гэта ж не навіна! ***Памятаеце нашы прыярытэты — экспарт, жыллё, харчаванне. Упускаць момант, каб заявіць аб сабе, нельга***. Будзем інтэнсіўна нарошчваць валютную выручку — атрымаем моцны беларускі рубель. Насельніцтва перастане асцярожнічаць, прапануе свае грошы ў дэпазіты, аблігацыі. Так паступальна наросцім базу для «доўгага» інвеставання. Старшыня Нацбанка гэта ведае. Гэта задача не толькі ўрада, але і банкаўскага блока», — падкрэсліваў Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, і сапраўды, інвестыцыі асядаюць. Папярэдні цыкл і звязаныя з ім буйныя праекты практычна завершаны. Тут, напрыклад, атамная станцыя, БНБК, Петрыкаўскі горнаабагачальны камбінат, цэлюлозныя і папяровыя комплексы, завяршаюцца праекты ў нафтаперапрацоўцы.

«Калі не абнаўляцца, то праз 3–5 гадоў будзем у аўтсайдарах па канкурэнтаздольнасці. Недзе сітуацыю нам папсавалі звонку, а недзе мы самі недапрацоўваем. Усе задачы па інвестыцыях дакладна прапісаны ў Праграме пяцігодкі, але разгортваюцца яны пакуль слаба. ***Трэба памятаць, што людзям патрэбны не лічбы і паказчыкі. Нашых грамадзян хвалююць блізкія ім пытанні — зарплата, работа, цэны***», — дадаў Прэзідэнт.

БЮДЖЭТ НА БУДУЧЫ ГОД

Праект бюджэту, паводле кіраўніка краіны, фарміруецца дэфіцытным, і зразумела, чаму: нясём незапланаваныя выдаткі. Але з іншага боку — пытанне, дадаў Аляксандр Лукашэнка: ці ўсе эканомяць і напружваюцца па скарачэнні неабавязковых выдаткаў?

«Таму ***пытанне эканомій, бяражлівасці зноў выступае на першы план***, — заўважае Прэзідэнт і пытаецца: «Ці ёсць крыніцы на пакрыццё дэфіцыту? Ці не пацягне гэта напружанасці пры выкананні сацыяльных абавязацельстваў? На практыцы для нас гэта значыць, што трэба ўзмацніць дысцыпліну і гнуткасць: пераарыентавацца на дружалюбныя гандлёвыя і фінансавыя рынкі, не звяртаючы ўвагі на выпады Захаду».

Асобна прасіў ён далажыць аб сітуацыі з дзяржаўным доўгам і планамі па яго пагашэнні. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліваў, што ***Беларусь заўсёды была і будзе бездакорным плацельшчыкам па сваіх абавязках. «Нягледзячы ні на якія цяжкасці, мы не маем права страціць гэтую рэпутацыю***», — заўважае Прэзідэнт.

Пытанні грашова-крэдытнай палітыкі традыцыйна праходзяць у нейкім аблегчаным фармаце, канстатуе кіраўнік краіны. «Але не гэтым разам. Як я адзначаў, тэма, якая цяпер найбольш абмяркоўваецца, — высокая інфляцыя. Аргументы аб тым, што яна «імпартаваная», я ўжо сказаў, наколькі іх мы можам прыняць. ***Мы плануем у будучым годзе мець адназначную лічбу ў шэсць працэнтаў інфляцыі***», — адзначыў Прэзідэнт.

ЗВЯНО Ў ЦІСКУ НА РАСІЮ

Па словах Прэзідэнта, Захад вядзе гібрыдную вайну не толькі супраць Беларусі — перадусім супраць Расіі. Наша краіна — толькі звяно ў гэтым ціску. «Больш за тое, мы аказаліся на пярэднім краі. Таму нам дастаецца першым. Мы гэта з Прэзідэнтам Расіі бачым, ацэньваем і дзейнічаем адпаведным чынам», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён сцвярджае: ёсць каналы, па якіх размаўляем з праціўнікамі. «Сумуючы ўсе іх прэтэнзіі (ужо ад прэтэнзій перайшлі да больш жорсткіх патрабаванняў і ультыматумаў), ***ад нас патрабуюць, каб Беларусь стала такой, як Украіна. Цытую: «Дэмакратычна перспектыўнай, развітой дзяржавай, як Украіна». На што ім дакладна два дні назад адказалі: «Мы ніколі не станем Украінай». У нас, беларусаў, сваё бачанне перспектыў.*** Тое, што творыцца на Украіне, вы выдатна бачыце. Думаю, што за гэтым сталом, дзе сабралася ўсё кіраўніцтва Беларусі, і нават ***сярод нашага насельніцтва, якое хоча нармальнага жыцця для сябе і сваіх дзяцей, няма жадання стаць другой Украінай***», — мяркуе Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заявіў, што ўвесь час сочыць, якія дзеянні ажыццяўляюць апаненты супраць Беларусі. Чарговым такім этапам кіраўнік краіны назваў міграцыйны крызіс.

Прэзідэнт заклікаў кіраўнікоў дзейнічаць рашуча, дысцыплінавана, без угавораў і доўгіх абмеркаванняў, часам імгненна. «***Галоўнай трэба зрабіць выканаўчую дысцыпліну.*** І мы элементарна выстаім і не дапусцім, каб тыя праблемы, што павінны мы рашаць, былі скінутыя на наш народ. ***Людзі хочуць жыць нармальна, і мы ў любой сітуацыі павінны забяспечыць гэта нармальнае жыццё***», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік краіны падкрэсліў, што даслоўна перадаў словы апанентаў наконт таго, што Беларусь павінна стаць другой Украінай.

«Яны намякаюць: «Ну пытанне не ва ўладзе...» Ва ўладзе пытанне! Зусім нядаўна заявілі: «Уладу ў Беларусі трэба памяняць. Пачынаць трэба з Прэзідэнта». У нас ёсць механізм. Выбары і гэтак далей. Датэрміновыя выбары, калі нехта хоча, — калі ласка, у нас таксама ёсць механізм. Няхай прапануюць. Таму я не нагнятаю абстаноўку!» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Прэзідэнта, тых заходніх дыпламатаў, што прыносіць падобныя ўльтыматумы, неабходна адпраўляць за межы краіны.

«Нягледзячы, чыю краіну яны прадстаўляюць. Што мы з імі цяпаемся? Яны ж працуюць на шкоду. Праўда, мы ўжо заўважылі, вось суткі прайшлі (гэтыя санкцыі ўводзіць збіраліся), ужо некаторыя пасольствы пакуюць чамаданы, заяўляючы аб тым, што Прэзідэнт прыме рашэнне, іх заўтра выкінуць. Павінен іх супакоіць: мы ні ў кога чамаданы і тое, што ў чамаданах, адбіраць не збіраемся, — кажа Прэзідэнт. — Таму вы мяне пачуйце — тыя, хто чамаданы пакуюць: супакойцеся, пакладзіце свае чамаданы. Калі мы аб'явім вас персонамі «нон грата», у вас будзе час для таго, каб узяць гэтыя чамаданы і з'ехаць».

Марыя ДАДАЛКА.

Прэзідэнт звярнуўся да прэм'ер-міністра Рамана Галоўчанкі: «Вось што я ад урада хачу бачыць у наступным годзе: захавайце вось гэты ўзровень абароненасці насельніцтва. Вось што ёсць у гэтым годзе, трэба захаваць. І крыху панізіць інфляцыю. Гэта разам з Калаурам (Павел, старшыня Праўлення Нацбанка. — **«Зв.»**). Усё. Я больш ад вас не патрабую ў гэтай сітуацыі».

Аляксандр Лукашэнка адзначае, што справа нават не ў санкцыях — з-за штама каранавіруса «Амікрон» пачала зніжацца сусветная эканоміка.

«Калі сусветная эканоміка апускаецца, яна будзе ў гэтую варонку зацягваць і Беларусь. Будзе цяжка разлічваць на нейкія вялізныя прарывы, паказчыкі, ВУП сем працэнтаў дададзім або вышэй за сусветны. Мы рэалісты. ***Таму галоўная наша задача — вось узровень гэтага года захаваць. Ён невысокі ў нас. І па заробках, сацыяльнай абароненасці, але дастатковы для таго, каб жыць. Няхай людзі не абураюцца. Жыць можна. Толькі трэба ім варушыцца трошкі. Як я ўжо казаў, распранайцеся і пачынайце працаваць. Ну калі яшчэ трошкі дададзіце, ну, тады — героі***», — матывуе Прэзідэнт.

Каментарый у тэму

Размову з журналістамі **прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА** пачаў з аптымістычнай заўвагі: складаны год адпрацавалі лепш, чым планавалі ў самым яскравым сцэнарыі. Рост маецца па ўсіх паказчыках, што характарызуюць стан эканомікі: і даходы насельніцтва, і ВУП, і экспартнае сальда, і плацежны баланс краіны.

«Мы не зрабілі нічога ўнікальнага. Толькі скарысталіся кан'юнктурай, што склалася. Нашы прадпрыемствы аказаліся разваротлівымі, мабілізаваліся. Гэта прынесла найлепшыя вынікі па якасных паказчыках экспарту за апошнія дзесяцігоддзі», — сказаў Раман Галоўчанка.

Па яго словах, не смаглі толькі належным чынам спрацаваць у сферы сельскай гаспадаркі і будаўніцтве. АПК падвяло надвор'е, маецца недабор зерня, але навёрстваюць гаспадаркі прадукцыяй жывёлагадоўлі і «малочкай». На будаўніцтва аказала ўплыў недаступнасць банкаўскіх крэдытаў для рэалізацыі будаўніцтва.

Адзначыў прэм'ер, што насельніцтва праяўляе зацікаўленасць да банкаўскіх укладаў. «Гэта сведчыць пра давер грамадзян да органаў улады, эканамічных улад, урада, Нацыянальнага банка. Гэта таксама кажа, што меры, рэалізаваныя для павышэння даверу да беларускай банкаўскай сістэмы, спрацавалі», — дадаў кіраўнік Саўміна.

Задача на будучы год для нацыянальнай эканомікі — ва ўмовах санкцыйнага ціску, пандэмічнага напружвання спрацаваць не горш, чым сёлета. Але ўрад плануе для сябе нават рост — не менш, чым у два працэнты.

Будзе працаваць Саўмін і над унутранымі прычынамі росту інфляцыі, якая аказвае негатыўны ўплыў на кошт банкаўскага крэдытавання, пакупніцкую здольнасць насельніцтва.

«Ужо зараз па выніках кастрычніка бачым, што інфляцыя запаволілася. І за 23 дні лістапада рост цэн склаў 0,2 працэнта. За месяц гэта можа быць 0,3 працэнта. Гэта стандартны ўзровень цэнавага росту, што мелі ў неінфляцыйныя гады. Будуць працягнуты пэўныя меры адміністрацыйнага рэгулявання і меры эканамічнага характару, каб стрымаць інфляцыю», — паведамляе прэм'ер.

Раман Галоўчанка дадаў, што асноўная небяспечнасць інфляцыі ў тым, што яна «з'ядае» рэальныя даходы насельніцтва. Але даходы, па яго словах, растуць хутчэй, чым інфляцыя.

Паведаміў журналістам прэм'ер-міністр і пра ўвядзенне Беларуссю мер у адказ на санкцыі.

«Мы неаднаразова папярэджвалі партнёраў пра тое, што не варта гэтага рабіць. Па-першае, гэта нелегітымна, па-другое, ад гэтага пакутуюць грамадзяне краіны, прадпрыемствы. Тым не менш гэтыя рашэнні прынятыя. Мы некалькі разоў не прымалі меры ў адказ, спадзеючыся на іх разважлівасць. Мы падрыхтавалі і ў найбліжэйшыя дні ўвядзём пакет мер эканамічнага рэагавання ў адказ на абмежавальныя дзеянні ў адносінах нашай краіны», — расказаў прэм'ер.

Ён заўважыў, што спіс чакаецца вялікі, і гэта будуць меры ў адказ на ціск на краіну. Па словах, гэты спіс будзе агучаны ў найбліжэйшыя дні.

Дзеля памяці

КАБ ЗАХАВАЦЬ МІР І СПАКОЙ

«Мы не можам пагадзіцца са спробамі сказіць нашу гісторыю»

Аб гэтым заявіў дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ падчас адкрыцця ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны выстаўкі «Бітва за Маскву. Бессмяротнасць подзвігу».

— Мы яшчэ раз пацвярджаем, што беларускі і расійскі народы разам, — падкрэсліў дзяржаўны сакратар. — Разам на шляху эканамічнай інтэграцыі, новы этап якой адкрылі прэзідэнты Расіі і Беларусі, разам асэнсоўваем тую Вялікую Перамогу, узіраючыся і ў дзень цяперашні, і ў дзень заўтрашні. Для нас гэта вельмі важна і каштоўна. Мы хочам, каб гэтая экспазіцыя была блізкая не толькі ветэранам, але і ўсім тым маладым людзям, якія сёння побач з намі. Сімвалічна, што ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску сабраліся ветэраны вайны, Узброеных Сіл — тыя людзі, якія памятаюць не толькі горыч выпрабаванняў і паражэнняў, але і радасць перамог.

Як адзначыла **Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля КАЧАНАВА**, Вялікая Айчынная вайна і ўсё, што звязана з ёй, — святое.

«Памяць аб гэтай вайне мы захавалі ў нашых сэрцах, і наша задача — перадаваць яе маладому пакаленню, — перакананая спікер верхняй палаты парламента. — Гэта аснова патрыятычнага выхавання моладзі Беларусі і Расіі — у гэтым няма ніякага сумнення. Менавіта гэта можа служыць падмуркам для таго, каб маладыя людзі памяталі, якой цаной дасталася тая Перамога. Дзякуючы нашаму старэйшаму пакаленню мы сёння жывём у такіх выдатных краінах — Беларусі і Расіі: міралюбівых, добрых, прыгожых».

Наталля Качанава паведаміла, што ў праекце змяненняў у Канстытуцыю захаванню памяці аб Вялікай Айчыннай вайне ўдзяляецца асаблівая ўвага. «На жаль, гісторыю імкнуцца перакруціць, але гэта зрабіць немагчыма, — акцэнтавала ўвагу яна. — Наша старэйшае пакаленне зрабіла ўсё дзеля таго, каб разграміць немцаў пад Масквой, каб не аддаць сталіцу сваёй Радзімы ворагу. Немцы былі разгромлены, і іх непераможнасць была звергнута. Мы павінны зрабіць усё дзеля таго, каб захаваць мір у нашых краінах. Сёння сітуацыя вельмі няпростая. Вы бачыце, як спрабуюць нагнятаць канфрантацыю, як спрабуюць скажаць гісторыю. Таму мы павінны памятаць сваю гісторыю, памятаць тых людзей, якія цаной свайго жыцця адстаялі свабоду і незалежнасць нашых краін. Мы павінны зрабіць усё, каб не дапусціць гэтага надалей. Ад нас, ад людзей, якія жывуць цяпер, ад тых, хто ідзе за намі, ад маладых пакаленняў, залежыць мір і спакой у нашых краінах. І мы павінны гэтую праўду несці ўсяму свету».

Выстаўка, а таксама экспертна-медыйны семінар, якія адбыліся пасля адкрыцця экспазіцыі, прысвечаныя святкаванню 80-й гадавіны пачатку контрнаступлення савецкіх войскаў у бітве пад Масквой. Маскоўская бітва — адна з найбуйнейшых у гісторыі сусветных войнаў: як па колькасці ўдзельнікаў, так і па колькасці ваеннай тэхнікі і ўзбраення. Да гэтай гістарычнай падзеі асаблівае стаўленне яшчэ і таму, што восенню 1941 года вайна разгарнулася ў прамым сэнсе слова «каля варотаў Масквы». Бітва за сталіцу СССР — пачатак нашай Перамогі, без якой нельга зразумець і ацаніць ні нашы страты, ні дасягненні.

У экспазіцыі — каля 250 прадметаў: дакументы, фотаздымкі, пісьмы, плакаты, узнагароды, асабістыя рэчы ўдзельнікаў тых падзей, зброя, творы выяўленчага мастацтва з фондаў Дзяржаўнага музея абароны Масквы, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Музея Перамогі.

Дзяржаўны музей абароны Масквы дэманструе ўнікальныя сведчанні бессмяротнага подзвігу абаронцаў Масквы: фотаздымкі ваенных фотакарэспандэнтаў Аляксандра Усцінава, Уладзіміра Мінкевіча, Міхаіла Савіна, плакаты перыяду пачатку бітвы за Маскву і дакументальныя матэрыялы. У аповед аб абароне і контрнаступленні пад сталіцай СССР арганічна ўпісаны і прадметы з фондаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Гэта матэрыялы, якія расказваюць пра лёсы байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі, ураджэнцаў Беларусі і Расіі, якіх у адно цэлае звязала вайна. 17-гадовым студэнтам разам з бацькам уступіў у народнае апалчэнне Масквы Пётр Бухтаяраў. Ён прайшоў усю вайну і ўдзельнічаў у вызваленні Беларусі. У народным апалчэнні пачынаўся і баявы шлях заслужанага мастака РСФСР Мікалая Абрыньбы. Ён трапіў у палон пад Вязьмай, змог уцячы і далучыўся да беларускіх партызан брыгады Дубава, якая дзейнічала на Віцебшчыне. Начальнікам артылерыі Заходняга фронту ў перыяд Маскоўскай бітвы быў беларус генерал-лейтэнант артылерыі Іван Камера. Медалём «За абарону Масквы» быў узнагароджаны ўраджэнец Магілёўскай вобласці Герой Савецкага Саюза Аляксандр Рабцэвіч — камандзір батальёна асобнай мотастралковай брыгады асаблівага прызначэння НКУС СССР, байцы якой змагаліся і на перадавой, і закідваліся ў тыл праціўніка.

Такім чынам, мінулыя падзеі, у якіх шчыльна пераплятаюцца лёсы беларусаў і расіян, сведчаць не толькі аб тым, што ў нашых народаў агульная гісторыя. Сёння мы разам павінны ў тым ліку захаваць памяць аб Вялікай Айчыннай вайне, каб будучыня, адна на дваіх, у нас таксама была светлая і мірная.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Блізкая ўлада

СЕНАТАРСКІ «ДЭСАНТ» У РЭГІЁНЕ

У сераду, 8 снежня, з 11.00 члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь правядуць адзіны дзень прыёму грамадзян у выканкамах Гродзенскай вобласці:

Старшыня Савета Рэспублікі КАЧАНАВА Наталля Іванаўна — у Лідскім райвыканкаме (г. Ліда, вул. Савецкая, д. 8; тэлефоны для запісу: 8 0154 53 40 30, 8 0154 53 40 21, 8 017 328 53 24, 8 017 327 46 76);

намеснік Старшыні Савета Рэспублікі ІСАЧАНКА Анатоль Міхайлавіч — у Скідзельскім гарвыканкаме (г. Скідзель, вул. Леніна, д. 45; тэлефоны для запісу: 8 0152 97 53 42, 8 0152 97 54 08, 8017 327 24 09);

старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве СІВЕЦ Сяргей Міхайлавіч — у Астравецкім райвыканкаме (г. Астравец, вул. К. Маркса, тэлефоны для запісу: 8 01591 7 52 01, 8 01591 2 86 10, 8 017 327 27 68);

старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні РУСЫ Міхаіл Іванавіч — у Навагрудскім райвыканкаме (г. Навагрудак, вул. Міцкевіча, д. 11; тэлефоны для запісу: 8 01597 3 93 03, 8 01597 4 26 39, 8 017 327 36 73);

старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах РУНЕЦ Тацяна Аркадзьеўна — у Гродзенскім гарвыканкаме (г. Гродна, пл. Леніна, д. 2/1; тэлефоны для запісу: 8 0152 62 69 31, 8 0152 62 69 16, 8017 222 49 90);

член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні САРОКА Эльвіра Аляксееўна — у Карэліцкім райвыканкаме (г. Карэлічы, пл. 17 верасня, д. 9; тэлефоны для запісу: 8 0156 2 12 55, 8 0156 2 18 24);

член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні ШЫШКО Аляксандр Мікалаевіч — у Гродзенскім райвыканкаме (г. Гродна, вул. Горкага, д. 51; тэлефоны для запісу: 8 0152 73 89 06, 8 0152 73 89 16);

член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы СЕРАФІНОВІЧ Кацярына Адамаўна — у Дзятлаўскім райвыканкаме (г. Дзятлава, вул. Леніна, д.18 каб. 105; тэлефоны для запісу: 8 01563 6 12 51, 8 01563 2 71 61);

член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве РАМАНАЎ Алег Аляксандравіч — у Смаргонскім райвыканкаме (г. Смаргонь, вул. Леніна, д.5, тэлефоны для запісу: 8 01592 3 76 57, 8 01592 3 76 06);

член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах БАЙКО Валянцін Валянцінавіч — у Мастоўскім райвыканкаме (г. Масты, пл. Леніна, д. 3; тэлефон для запісу: 8 01515 6 13 04, 8 01515 4 53 20). Папярэдні запіс ажыццяўляецца 6 і 7 снежня з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00.

Акрамя таго, напярэдадні адзінага дня прыёму, 7 снежня з 11.00 старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы РАЧКОЎ Сяргей Анатольевіч правядзе прыём грамадзян у Ашмянскім райвыканкаме (г. Ашмяны, вул. Савецкая, д. 103; тэлефоны для запісу: 8 01593 2 21 32, 8 01593 2 21 13, 8017 327 27 18). Папярэдні запіс — 6 снежня з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00.

Наша пазіцыя

«СЛЯПАЯ ЛЮТАСЦЬ АД АДСУТНАСЦІ ВЫНІКУ»

Міністэрства замежных спраў выступіла з заявай у сувязі з прыняццем ЕС чарговага пакета санкцый у адносінах да Беларусі.

«Глыбіня абсурду як непасрэдна рашэння Еўрапейскага саюза аб чарговых санкцыях супраць суверэннай Беларусі, так і самога яго зместу ўжо з цяжкасцю паддаецца разуменню, — гаворыцца ў дакуменце. — Еўрачыноўнікі прыдумалі нейкую агрэсію з боку мірнай Беларусі і, нягледзячы на разважлівасць, прадстаўленыя факты, пачатыя тэхнічныя кансультацыі і дадатковыя меры па стрымліванні нелегальнай міграцыі, якія прымаюцца беларускім бокам, крывадушна нанеслі санкцыйны ўдар».

У заяве адзначаецца: «У дэструктыўных мэтах прадоўжана адкрытая дэманізацыя нашай краіны — увесь цяжар адказнасці ўскладаецца на Беларусь пры нахабным ігнараванні сапраўдных прычын глабальнага міграцыйнага крызісу. Мэта ўсёй гэтай палітыкі — эканамічна ўдушыць Беларусь, максімальна ўскладніць і пагоршыць жыццё беларусаў. Высакамоўнае глупства, якое гучыць з еўрапейскіх трыбун, у дадзеным выпадку не мае да рэальнасці ніякіх адносін».

«Фармальна абапіраючыся на безадказныя мантры аб узмацненні націску, ЕС па-ранейшаму застаецца глухім да зваротаў мільёнаў беларускіх працоўных, якія патрабуюць адмены гэтых варварскіх і антыгуманных мер, — звярнулі ўвагу ў МЗС Беларусі. — На гэтым шляху Еўрасаюзу не важна, што пацерпяць дзясяткі тысяч беларускіх грамадзян і членаў іх сем'яў, еўрапейскія спажыўцы, пастаўшчыкі, бізнесмены і кампаніі. Такія «дробязі» для іх нічога не значаць, калі хочацца пагуляць у геапалітыку або задаволіць прагматычныя дзелавыя інтарэсы пэўных еўрапейскіх колаў. Менавіта таму ў пакет уключаны беларускія прадпрыемствы, якія не маюць ніякіх адносін да міграцыйнага крызісу. За гэтым хаваецца жаданне пазбавіцца ад канкурэнтаў».

«Відавочна, што гэты прэсінг будзе прадоўжаны ў сляпой лютасці ад адсутнасці выніку. У гэтым выпадку вынік для еўрапалітыкаў — знішчэнне Беларусі як суверэннай, эканамічна паспяховай дзяржавы. Беларусь не першы раз сутыкаецца з такімі выклікамі з боку Захаду. Як і раней, беларуская дзяржава памацнее, пройдзе гэты этап годна і абароніць адпаведны ўзровень жыцця свайго насельніцтва», — гаворыцца ў заяве беларускага знешнепалітычнага ведамства.

Згубнасць і бесперспектыўнасць санкцый даўно відавочны для ўсіх разважлівых людзей, гэтак жа, як і іх негатыўнае ўздзеянне на абодва бакі. «Разам з тым выключна ў якасці адказу намі, як і заяўлялася раней, будуць прыняты жорсткія, асіметрычныя, але адэкватныя меры», — адзначаецца ў дакуменце.

«Чым далей будзе прадаўжацца гэты працэс, тым больш відавочнай становіцца яго небяспека ўжо для стабільнасці і бяспекі ўсяго нашага рэгіёна, — лічаць у Міністэрстве замежных спраў Беларусі. — І віна за ўсё ляжыць выключна на ініцыятары санкцыйнай спіралі і агрэсіі — Еўрапейскім саюзе».

«Мы ўсё яшчэ заклікаем еўрапейскіх палітыкаў адумацца», — гаворыцца ў заяве МЗС.

ТЫМ ЧАСАМ

З заявай выступіла і беларускае Міністэрства інфармацыі ў сувязі з увядзеннем ЕС і Вялікабрытаніяй персанальных санкцый да прадстаўнікоў беларускіх СМІ. У Мінінфарме з абурэннем успрынялі гэтую навіну. «Прычым гэтым разам недапушчальная практыка абмежавальных мер і ціску апроч кіраўнікоў дзяржаўных медыя была распаўсюджана і на простых журналістаў. Тым самым еўрапейскія ўлады працягнулі і без таго дрэнна хаваны курс на нівеліраванне агульнапрызнаных стандартаў журналістыкі і ўкараненне цэнзуры», — гаворыцца ў заяве.

У міністэрстве дадалі, што ўвядзенне санкцый сведчыць аб двудушнай пазіцыі краін ЕС і Вялікабрытаніі ў дачыненні да абвешчаных імі прынцыпаў свабоды слова і выказвання меркаванняў.

НЕ КАШТОЎНАСЦІ, А ПРАГА ЎЛАДЫ

Пазіцыю Беларусі па тым, што адбываецца вакол нашай краіны, выказаў і міністр замежных спраў Уладзімір Макей, выступаючы на пасяджэнні СМЗС АБСЕ ў Стакгольме.

«Нашы заходнія партнёры навучаюць Беларусь сваёй «ідэальнай» версіі дэмакратыі, — сказаў міністр. — Аднак калі размова заходзіць аб іх уласных палітычных або эканамічных інтарэсах, то аддаюць перавагу дэмакратыі іншай, «для дамашняга карыстання».

Пры гэтым кіраўнік беларускага МЗС звярнуў увагу: «Суседнія з Беларуссю краіны толькі за апошнія два месяцы парушылі непасрэдна з дзясятак асноўных міжнародных дагавораў і канвенцый. Міжнароднай рэакцыі — нуль. Як гэта разумець?»

Ён таксама выказаў меркаванне: «Пара прызнаць, як гэта нядаўна зрабіў прэзідэнт Макрон, што штучнае і сляпое насаджэнне выдуманых стандартаў не садзейнічае эвалюцыйнаму развіццю ні нацыі, ні дзяржавы, ні грамадства. Яно толькі адкідае гэта развіццё далёка назад, разбурае суверэнітэт».

На прасторы АБСЕ палаюць войны — інфармацыйныя і гібрыдныя, заявіў Уладзімір Макей. «Пад надуманай прычынай міграцыйнага крызісу на граніцы ЕС і Беларусі імкліва нарошчваецца ваенны патэнцыял НАТА. Для вайны з кім? — задаў пытанне кіраўнік беларускага Міністэрства замежных спраў. — Вадамёты з пярцовым газам, святлошумавыя гранаты, якія ляцяць з Захаду ў жанчын і дзяцей, цкаванне сабакамі, збіванні да смерці. Гэта нармальна?»

Уладзімір Макей таксама звярнуў увагу: «Будучае развіццё кантынента ўсё больш вызначае логіка санкцыйнага процістаяння. Пры гэтым яна хітра ўпакавана ў жудасныя лжывыя фразы аб тым, што санкцыі нясуць дабро простым людзям і ўмацоўваюць суверэнітэт дзяржавы. Нядаўна спадар Жазэп Барэль (вярхоўны прадстаўнік ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі. — **«Зв»**.) адкрыта заявіў, што лічыць ЕС і ЗША ўладарамі свету. Паводле яго слоў, трэба і далей дыктаваць усім стандарты з адной галоўнай мэтай — не страціць уладу ў гэтым стагоддзі».

«Гэта значыць, што больш не каштоўнасці, а прага ўлады ў аснове палітыкі Захаду. Дзе ісціна? Хто носьбіт праўды?» — задаў рытарычныя пытанні кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Беларусі.

ТОЕ, ШТО НАС ЗВЯЗВАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пагадзіцеся, не цікава ўвесь час чытаць толькі ў тэлефоне, часам хочацца ўзяць у рукі часопіс або газету, удыхнуць пах паперы і друкарскай фарбы, пашамацець старонкамі. І потым, аддзяленне сувязі — для многіх проста магчымасць пагутарыць. Асабліва для пажылых.

Асіповіцкі ўчастак паштовай сувязі — гэта 25 стацыянарных паштовых аддзяленняў (з іх толькі сем гарадскія, астатнія — сельскія) і два перасоўныя аддзяленні паштовай сувязі плюс бізнес-пошта. Працы ў паштальёнаў дастаткова і ў эпоху інтэрнэту, распавядае **начальнік участка Надзея БАГАЧОВА**.

Яна кажа, што сёння адна з самых запатрабаваных паслуг і сярод юрыдычных асоб, і сярод фізічных (то-бок звычайных карыстальнікаў) — паскораная пошта EMS: сёння на заўтра ці сёння на сёння.

— Шматлікім фірмам, кампаніям і ўстановам трэба тэрмінова адправіць дакументы або таварныя ўкладанні. А для людзей гэтая паслуга зручная, калі, напрыклад, вам неабходна адправіць падарунак да дня нараджэння каму-небудзь з родных, якія жывуць далёка: яго даставяць на наступны дзень раніцай або ў вызначаны час. Праграма «паскораная пошта EMS» працуе не толькі па Беларусі, але і па ўсім свеце. У многіх дзеці жывуць за межамі краіны, і часам пошта — адзіная магчымасць нешта перадаць ці атрымаць ад іх.

НАВОШТА ПАДПІСВАЦЬ ПАШТОЎКІ?

З самага адкрыцця ў аддзяленні паштовай сувязі Асіповічы-5 шматлюдна. Людзі прыходзяць і пакласці грошы на тэлефон, і камунальныя паслугі аплаціць, і пенсію атрымаць.

— У дзень праз наша аддзяленне праходзіць мінімум трыста чалавек, — кажа Ларыса Аляксандраўна. — І лісты пішуць, і паштоўкі падпісваюць: па Беларусі, на Расію і далёкае замежжа. Калі людзі прывыклі віншаваць блізкіх з днём нараджэння, Новым годам, юбілеем паштоўкай — яны будуць гэта рабіць, як бы ні змяняўся свет. І сапраўды прыемна яе атрымаць. Электронную паштоўку вам даслалі ў месенджар — яна згубілася, і вы на яе забыліся. А папяровая паштоўка — гэта нешта матэрыяльнае. Падпісаная ад рукі, яна захоўвае цяпло душы адпраўніка. І таму яе хочацца захаваць на доўгую памяць.

Паштоўкі на стойцы — на ўсе выпадкі жыцця. Ёсць і аўтарскія, ручной работы.

— Попытам карыстаюцца «З днём вяселля», «З юбілеем», з прафесійнымі святамі і канверты для грошай — часцей за ўсё таксама з вясельнай тэматыкай.

ЧАС ПІСАЦЬ ДЗЕДУ МАРОЗУ

Дарэчы, у паштовых аддзяленнях ужо з'явілася скрыначка для лістоў Дзеду Марозу.

— Прымаем заяўкі і на падарункі, і на лісты ад Дзеда Мароза, — распавядае Ларыса Аляксандраўна.

Заявак на лісты ад зімовага чараўніка і на падарункі ад яго ўжо досыць шмат. Штогод іх у аддзяленні бывае каля двухсот, а ў гэтым годзе, хутчэй за ўсё, будзе больш.

— З 27 снежня пачнём дастаўляць іх нашым маленькім кліентам на дом, — кажа яна.

Дзеці (і пенсіянеры, але пра іх — пазней), напэўна, — самыя ўдзячныя кліенты пошты. Дзятва ўжо ацаніла, што цацкі тут недарагія.

— І гэта якасныя і бяспечныя цацкі ад розных вытворцаў, — распавядае мама трохгадовага Стаса.

Яна прыйшла ў аддзяленне атрымліваць тавары з «Аліэкспрэс». Кажа, па іншых падставах на пошту не ходзіць: навіны чытае ў тэлефоне, плацяжы здзяйсняе анлайн. А вось яе бацькі бываюць у гэтым паштовым аддзяленні некалькі разоў на месяц: і па свежую газетку прыходзяць, і камуналку аплачваць. Начальнік асіповіцкага ўчастка паштовай сувязі расказвае, што калі раней па пасылкі «Аліэкспрэс» прыходзіла ў асноўным моладзь, то сёння і пенсіянеры засвоілі шопінг анлайн.

Аддзяленне размешчана каля чыгуначнага вакзала, але нямала тут і пастаянных кліентаў — з многімі наведвальнікамі супрацоўнікі вітаюцца як з добрымі знаёмымі.

— Пошта ў невялікім горадзе — адзін з цэнтраў гарадскога жыцця. Мы ведаем практычна ўсіх у Асіповічах. Сярод нашых кліентаў — каля 300 прадпрыемстваў і юрыдычных асоб, якія працуюць у горадзе, — кажа Надзея Васільеўна. — Напрыклад, ёсць у нашым горадзе заўзяты філатэліст, які абменьваецца маркамі з калекцыянерамі па ўсім свеце. Мы спецыяльна для яго заказваем маркі, якія яму патрэбны.

Акрамя таго, аддзяленне сувязі N 5 г. Асіповічы абслугоўвае больш за 1000 пенсіянераў горада і навакольных населеных пунктаў. Калі ўлічыць, што працуе тут пяць паштальёнаў, то на кожнага прыпадае каля 200 бабуль і дзядуль.

У сельскіх населеных пунктах паштальён, як і дзесяцігоддзі таму, — жаданы госць і веснік добрых навін.

Практычна кожнага пенсіянера паштальёны ведаюць па імені і імені па бацьку.

ПАШТАЛЬЁН ПРЫНОСІЦЬ РАДАСЦЬ

Карэспандэнцыя на ўчастак паштовай сувязі прыходзіць ноччу, яе разбіраюць і ўжо раніцай адпраўляюць па маршрутах. Пасылкі да трох кілаграмаў дастаўляюцца ходам паштальёна, ад трох да пяцідзесяці — аўтатранспартам.

— Мы абслугоўваем 150 населеных пунктаў, — адзначае Надзея Васільеўна. — Вязём і прадукты харчавання, бо пажылым далекавата часам ісці да цэнтральнай сядзібы. Усё свежае, недарагое і ў вялікім асартыменце. З улікам пандэміі нашы паштальёны дастаўляюць пажылым тавары паўсядзённага попыту, каб яны менш хадзілі па крамах: прамысловыя тавары, прадукты харчавання. А яшчэ нашы бабулечкі вельмі любяць шакалад. Калі прыязджаюць унукі-праўнукі, у бабулі заўсёды ёсць запас цукерак. І паштальёнаў нашых любяць, ведаюць па імёнах і заўжды чакаюць. Калі падыходзіць час пенсіі, тэлефануюць на пошту: «Ну, калі ўжо Наташачка прыйдзе?» — усміхаецца суразмоўца.

Паштальён у невялікім горадзе, а тым больш на вёсцы — гэта ж не толькі пошта і пенсія. Сёння паштовы работнік з дапамогай дадатка «Мабільны паштальён» прыме плацяжы па картцы, дапаможа аплаціць камунальныя паслугі праз АРІП і пакласці грошы на тэлефон, аформіць падпіску (калі пенсіянер любіць нейкае выданне, то ён звычайна звычак не мяняе — застаецца верны яму, кажуць паштальёны). Ды і проста пагутарыць, выслухае, параіць.

Сярэдні ўзрост супрацоўнікаў пошты ў Асіповічах — 30 гадоў, расказвае суразмоўца. Хоць ёсць і тыя, хто прапрацаваў у гэтай сферы чвэрць стагоддзя. І справа не толькі ў тым, што ў невялікім гарадку, калі казаць аб занятасці, няшмат варыянтаў.

— Прывыкаеш да гэтай працы, да сваіх пастаянных кліентаў, якія чакаюць паштальёна як носьбіта нечага добрага. Што галоўнае для паштовага работніка? Ды проста любіць сваю працу! — кажа Ларыса Гранач. — Я люблю яе за шырокае кола зносін і за тую радасць, якую мы прыносім людзям.

Дзіяна РОНІНА.

«ТЫ Ж МАЛАДЫ, ТАБЕ ГЭТА ТРЭБА?»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэта была амаль дэтэктыўная гісторыя, бо я прыехаў у райцэнтр без дакументаў (проста пацікавіца), але работу ў выніку атрымаў. Калі накіраваўся праз пэўны час на сваёй машыне знаёміцца з будучым месцам працы, бачу, што на спідометры ўжо 12 кіламетраў ад Верхнядзвінска, а на ўказальным знаку на павароце напісана, што да Сар'і... яшчэ 11 кіламетраў! Падумаў, нічога сабе! Але калі трапіў у Сар'ю, то мяне гэтыя мясціны адразу зачапілі. Фактычна там праходзіць мяжа, дзе сутыкаюцца дзве культуры: Захад і Усход, каталіцтва і праваслаўе. Захапіў неверагоднай прыгажосці храм, пабудаваны ў сярэдзіне XIX стагоддзя Ігнаціем Лапацінскім у гонар памерлай жонкі Марыі, адзін з самых выразных неагатычных храмаў у Беларусі з цікавай гісторыяй (у розныя часы ён пераходзіў то каталікам, то праваслаўным, зараз гэта Царква Успення Прасвятой Багародзіцы), ландшафтны парк, рака Сар'янка... Да таго ж для мяне як для гісторыка і этнографа вельмі цікава вывучаць і гэтыя мясціны і іх жыхароў. Я ўжо і сам магу праводзіць экскурсіі па Сар'і. Калі звяртаюцца, не адмаўляю.

Як дабіраюся да працы штодня — асобная гісторыя. Расклад рэйсавых аўтобусаў (панядзелак, серада, пятніца) мне, зразумела, не падыходзіць. Машына не новая і часта ламаецца, што цягне шмат грошай на рамонт, а ў моцныя маразы «дызель» і ўвогуле праблематычны завесці. Тады выратоўвае аўтаспын. І самае частае пытанне, якое чую ад кіроўцаў: «Ты ж малады, навошта табе гэта трэба?» Адчуваю сябе нейкім дзіваком, затое мне робяць зніжку на станцыі тэхнічнага абслугоўвання, пры карыстанні таксі *(зноў смяецца)*. Хоць ёсць і неразменне, але і павага таксама. Усё ж такі ў сельскай мясцовасці настаўнік яшчэ не страціў свой статус і мае аўтарытэт...

Пяць гадоў таму, калі выпускнік Полацкага ўніверсітэта прыйшоў у Сар'янскую базавую школу, там было 100 вучняў, а цяпер іх колькасць зменшылася ўдвая. Справа ў тым, што шматдзетныя сем'і атрымліваюць жыллё ў Полацку, Наваполацку, Верхнядзвінску і з'язджаюць. Узнікае заканамернае пытанне: а якая ж нагрузка ў гісторыка?

— Не хвалюйцеся за мяне, максімальна магчымая — 36 гадзін, — запэўнівае Дзяніс Іванавіч. — Акрамя гісторыі і грамадазнаўства, я выкладаю геаграфію, мастацтва, працую педагогам-арганізатарам, вяду гурток па краязнаўстве...

ШКОЛА ЦІ БІЗНЕС?

Хоць быў у жыцці сельскага настаўніка перыяд, калі ён вырашыў паспрабаваць сябе яшчэ і ў бізнесе. Жартуе, што думка пра пошукі дадатковай крыніцы даходу з'явілася ў яго пасля таго, як скончылася першая зарплата. Вырашыў адкрыць магазін па продажы разліўной парфумерыі і касметыкі. У яго былі нават дзве гандлёвыя кропкі.

— Да таго ж мне было цікава даведацца, як працуе бізнес і эканоміка знутры, бо я ж яшчэ і настаўнік грамадазнаўства, — канстатуе ён. — Даведаўся... Нават атрымліваў нейкі даход, які вельмі ўратоўваў, калі адпускныя грошы ўжо скончыліся, а да зарплаты яшчэ працаваць і працаваць. Але праз 3,5 года зразумеў, што ў маленькім гарадку вышэй за пэўны ўзровень скокнуць нельга, таму трэба пашыраць свой бізнес, асвойваць суседнія раёны, але тады давядзецца кідаць школу. Сумяшчаць далей гэтыя дзве справы стала немагчыма. І я зрабіў свой выбар на карысць школы. Зразумеў, што калі табе штосьці падабаецца рабіць, то трэба прысвячаць сябе гэтаму занятку цалкам, і тады ўсе твае выдаткі — і маральныя, і фізічныя — абавязкова акупяцца.

ГІСТОРЫЯ МАЛОЙ РАДЗІМЫ

Сёння ён з задавальненнем дзеліцца сваімі педагагічнымі знаходкамі з калегамі. Адна з іх — клуб «VANDROŬKI AMATARAŬ PISTORYI». Калі малады настаўнік прыйшоў у школу, яму адразу даручылі класнае кіраўніцтва. Але ён не ведаў, як матываваць дзяцей, для якіх адзнакі ў лічбах мала што значылі. І тады вырашыў прымяніць рэйтынгавую сістэму (пазычыў ідэю ў сваіх універсітэцкіх выкладчыкаў). А каб дзеці трапілі на кручок, пачаў расказваць ім пра свае вандроўкі, паходы, этнаграфічныя і археалагічныя экспедыцыі, вясёлыя гісторыі, з імі звязаныя, і падмацоўваў аповеды фатаграфіямі і відэа. Нарэшце пачуў: «А калі мы пойдзем у паход?» Так быў заключаны дагавор: вучні стараюцца павысіць свае адзнакі кожную чвэрць (сярэдні бал хоць на некалькі дзясятых), а ўзнагародай за іх намаганні стане сумесная вандроўка з начоўкай. Цікава, што ў ходзе заключэння дагавора дзеці прапісалі, хто і за што будзе ў іх калектыве адказваць. Размеркавалі ролі па здольнасцях і інтарэсах, але нішто не перашкаджала ім паспрабаваць сябе ў іншай ролі. І вось такая «гульня» прынесла плён — напрыканцы вучэбнага года ўсе вучні заслужылі права пайсці ў паход. Мае калегі пыталіся: «Што ты з імі зрабіў? Яны гатовыя на ўсё, каб толькі павысіць сваю адзнаку...»

Даведка

Сар'я — аграгарадок (да 2008 — вёска) у Верхнядзвінскім раёне Віцебскай вобласці. Размешчаны на правым беразе Сар'янкі. Праз аграгарадок праходзіць аўтамабільная дарога абласнога значэння Верхнядзвінск — Асвея. Першыя пісьмовыя згадкі Сар'і датуюцца 1506 годам.

«Калі жадаеце застацца ў памяці вучняў, зрабіце для іх тое, што яны чакаюць, — раіць Дзяніс Казлоў. — Ноч у лесе каля вогнішча. Ніхто не прымушае класіся спаць... Я асабіста не памятаю нават самыя лепшыя ўрокі свайго настаўніка біялогіі, затое памятаю ўсе нашы паходы — як гэта было крута, складана і цікава... Цяпер нашы вандроўкі з вучнямі сталі рэгулярныя. Зіма, восень, вясна, лета... Толькі б спрыяла надвор'е. Калі я пяць гадоў таму трапіў у Сар'янскую школу, амаль нічога не ведаў пра гэтыя мясціны. Мой родны Лёзна, гісторыю якога я даследаваў, знаходзіўся на адлегласці ў 250 кіламетраў ад цяперашняга месца дыслакацыі. І гэтыя гістарычныя плямы трэба было ліквідаваць. А яшчэ ў мяне быў пасляўніверсітэцкі сіндром: высветлілася, што гісторыя, якую я як «місіянер» прыехаў выкладаць «абарыгенам», мала каго прываблівае. Вучням цікавая найперш гісторыя іх радзімы, прычым не толькі ў рамках школьнай праграмы, а непасрэдна на месцы гістарычных падзей. Пасля таго, як даведаліся аб месцазнаходжанні цікавых гістарычных мясцін, мы пачалі складаць маршруты, каб потым больш грунтоўна іх даследаваць і пачаць распрацоўку гістарычнага матэрыялу. Падчас аднадзённых экспедыцый былі запісаны інтэрв'ю з удзельнікамі розных падзей, якія маюць каштоўнасць для гісторыі. Дзецям цікава рабіць відэаролікі — як справаздачу пасля чарговай вандроўкі. Праўда, сутыкнуліся з адной праблемай: ёсць столькі людзей, з якімі трэба пагутарыць, і столькі месцаў, дзе трэба пабываць! Часу на ўсё не хапае! А калі яшчэ запрасіць з сабой у паход цікавага госця...

Вучням цікавая найперш гісторыя іх радзімы, прычым непасрэдна на месцы гістарычных падзей.

Шыкоўная вандроўка па лініі Сар'я — Калюты — Муйжа — Папартнава — Пушча — Вознава — Сар'я, якая адбылася ў верасні гэтага года, запомнілася ўсім сустрэчай з неверагодным чалавекам — нас суправаджаў Антон Францавіч Бубала, краязнаўца і паэт, які пагадзіўся прыадкрыць дзіўныя таямніцы роднага кутка. Гэта была вандроўка з цікавымі гісторыямі і прыгожымі вершамі, якія мы ўсе слухалі з захапленнем. Мяркую, што калі б сустрэча адбылася ў сценах школы, то такога эфекту ніколі б не атрымалі. Да таго ж, нягледзячы на паважаны ўзрост земляка, нашы маладыя ногі ледзь паспявалі за сталым турыстам», — дзеліцца ўражаннямі Дзяніс Казлоў.

У першыя паходы настаўнік з вучнямі бралі з сабой старыя цяжкія савецкія палаткі з прадзіраўленага палатна, праз якія камары праходзілі наскрозь, не заўважаючы перашкод. Але потым намаганні «олдскульнага» педагога былі заўважаны, і старшыня калгаса дапамог набыць сучасныя палаткі, спальнікі і турыстычныя дывянкі. Знайшліся і спонсары, якія дапамаглі з сучасным турыстычным рыштункам.

— Калі ты ўсё робіш ад душы, калі гарыш, гэта абавязкова заўважаць і падтрымаюць, — запэўнівае сельскі настаўнік. — Галоўнае — не стаяць на месцы і развівацца. Няважна, дзе вы жывяце і працуеце, усім дзецям павінна быць аднолькава даступная якасная і сучасная адукацыя: і сельскім, і гарадскім. Прызнаюся, што я сам сабе сказаў: калі ты не пройдзеш конкурсны адбор у праграму «Настаўнік для Беларусі», то, напэўна, трэба ставіць кропку ў гэтым жыццёвым этапе. Пяць гадоў у сельскай школе... Шмат зроблена для дзяцей, спадзяюся, што застаўся ў памяці сваіх вучняў, і трэба, напэўна, ісці далей. Проста каштоўнасці і ідэі, закладзеныя ў гэту праграму, мне вельмі блізкія — унікальныя магчымасці трэба стварацца для ўсіх дзяцей, а не толькі для гарацкіх. А цяпер я трапіў у супольнасць вельмі апантаных людзей і сапраўдных прафесіяналаў... Адчуваю сябе карысным для сваіх вучняў. Мяне сюды накіраваў Бог, альбо лёс, альбо неба...

ПРОСТА БАЦЬКА...

Сёння ў Дзяніса Казлова — моцная сям'я, двое дзяцей ва ўзросце чатыры і паўтара года. Жонка (музыкант па прафесіі) падтрымала мужа ў яго жаданні паехаць працаваць у вёску.

— Мой тата быў бульдазерыстам, — кажа педагог. — Памятаю, як ён вечарам прыходзіў дадому, мыў рукі і станавіўся маім бацькам. Я ніколі не бачыў, каб ён прыносіў рухавік і пачынаў яго перабіраць, таму што заўтра ў яго важная праца і трактар павінен завесціся. Ён ніколі ад мяне не адмахваўся, таму што заняты.... І я вырашыў, што для сваіх дзяцей таксама абавязкова буду добрым бацькам. Для мяне гэта насамрэч вельмі важна!

Я праводжу ў школе 8 гадзін штодня і ніколі не бяру работу дадому. Магчыма, хтосьці з маіх калег мяне не зразумее ці нават асудзіць. Многія працуюць суткамі на знос і чужыя дзеці (вучні) у іх больш дагледжаныя, чым свае. Таму я заклікаю ўсіх: калі вы стварылі сям'ю, то будзьце найлепшымі мужамі ці жонкамі і найлепшымі бацькамі для сваіх дзяцей. Канешне, цалкам выкрасліць школьны бок майго жыцця, калі я пераступаю парог свайго дома, мне не ўдаецца, бо ёсць чаты ў сацыяльных сетках, дзе я кантактую са сваімі вучнямі. Але разам з тым яны дазваляюць і спрасціць многія рабочыя моманты. Калі мяне запытаюць, ці раю я станавіцца сельскім настаўнікам, адкажу: так, раю. А ці раю жаніцца? Раю! Я адчуваю, што рэалізоўваюся як мужчына, калі клапачуся аб сваёй сям'і».

Надзея НІКАЛАЕВА.

Знак якасці

ДВОЙЧЫ НАЙЛЕПШЫ ЭКСПАРЦЁР

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт прызнаны лепшым экспарцёрам у галіне адукацыі

Фота прэс-службы БДУ.

БДУ перамог у намінацыі «Адукацыя» ў конкурсе «Найлепшы экспарцёр 2020». Дыплом і памятную статуэтку рэктару БДУ Андрэю Каралю ўручыў старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір УЛАХОВІЧ.

Такая высокая ўзнагарода стала магчымай дзякуючы актыўнай рабоце БДУ па навучанні замежных грамадзян. Цяпер у БДУ праходзяць падрыхтоўку больш за чатыры тысячы замежных студэнтаў з больш як 60 краін, што з'яўляецца самым высокім паказчыкам па краіне. Яшчэ тры гады таму гэтая лічба вагалася ў межах 2,5 тысячы. За апошнія чатыры гады колькасць адукацыйных праграм на англійскай мове павялічылася ва ўніверсітэце амаль у шэсць разоў. Сёння тут дзейнічаюць 23 праграмы на англійскай мове: 18 — на другой ступені і 5 — на першай. У 2017 годзе іх было ўсяго чатыры.

Таксама заахвочвальным дыпломам у намінацыі «Адукацыя» адзначаны Інстытут бізнесу БДУ.

Усяго па выніках 2020 года пераможцамі рэспубліканскага конкурсу сталі 22 прадпрыемствы і 30 узнагароджаны заахвочвальнымі дыпломамі ў 22 розных намінацыях. Сярод іх «Вытворчасць бытавых тавараў для насельніцтва», «Распрацоўка інфармацыйных тэхналогій», «Машынабудаванне і металаапрацоўка», «Металургія», «Сельская гаспадарка», «Транспарт і лагістыка», «Паслугі», «Вытворчасць тавараў, прызначаных для лячэння і рэабілітацыі», «Лёгкая прамысловасць», «Малочная прамысловасць» і іншыя.

У фінальным этапе спаборніцтва ацэньвалася фінансава-гаспадарчая дзейнасць 118 рэспубліканскіх прадпрыемстваў.

Для БДУ ўзнагарода ў конкурсе стала другой за ўсю гісторыю яго правядзення. У 2016 годзе ўніверсітэт таксама быў узнагароджаны гэтага статусу.

Конкурс «Найлепшы экспарцёр» праводзіцца штогод з 2009 года Беларускай гандлёва-прамысловай палатай сумесна з міністэрствамі, дзяржкамітэтамі, канцэрнамі, аблвыканкамамі, Мінскім гарвыканкамам, бізнес-саюзамі, Нацыянальнай акадэміяй навук, Беларускай універсальнай таварнай біржай, страхавой кампаніяй «Белэксімгарант» і адміністрацыяй ПВТ.

Ён накіраваны на стымуляванне развіцця экспартна арыентаванай вытворчасці, павелічэння аб'ёмаў і канкурэнтаздольнасці экспартаванай прадукцыі.

У намінацыі «Адукацыя» лаўрэатаў сталі вызначаць з 2015 года.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Вы прасілі расказаць

ВАКЦЫНАЦЫЯ І РЭВАКЦЫНАЦЫЯ:

калі і каму прышчапляцца ад каранавіруса паўторна

Ці трэба здаваць тэст на антыцелы перад рэвакцынацыяй? Каму і праз які час яна паказана? Якую вакцыну выбраць для паўторнай прышчэпкі ад каранавіруса? Пра тое, што змянілася ў падыходах да вакцынацыі, мы паразмаўлялі з намеснікам галоўнага ўрача Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірынай МІЛАНОВІЧ.

— Ірына Уладзіміраўна, чацвёртая хваля каранавіруснай інфекцыі ў Беларусі ідзе на спад. Ці ёсць сэнс зараз вакцынавацца, калі можа змяніцца штам?

— Так, менавіта ў гэты перыяд адноснай эпідэміялагічнай спрыяльнасці на фоне яўнага зніжэння захваральнасці на каранавірусную інфекцыю і варта засцерагчы сябе ад гэтай інфекцыі і яе цяжкіх наступстваў, зрабіўшы выбар на карысць вакцынацыі.

Нягледзячы на зменлівасць вірусаў, існуючыя вакцыны аказваюць сваё ахоўнае дзеянне, і абаранюць ад смяротных выхадаў і цяжкага ходу захворвання.

— Колькі людзей у Мінскай вобласці ўжо прышчэплена? Колькі плануецца прышчапіць для дасягнення калектыўнага імунітэту?

— У Мінскай вобласці першай дозай вакцыны з 2-разовай схемай вакцынацыі ўжо прышчэплена 488 508 чалавек, што складае 34,3 % ад усяго насельніцтва, у тым ліку поўны курс вакцынацыі прайшлі 360 825 чалавек, або 25,3 %. Для дасягнення калектыўнага імунітэту на ўзроўні, здольным аказваць уплыў на ход эпідэміялагічнага працэсу, да канца гэтага года неабходна прышчапіць 50 % насельніцтва. Ёсць раёны, якія набліжаюцца да гэтага — больш як 41 % насельніцтва вакцынавана ў Нясвіжскім, Пухавіцкім, Старадарожскім і Стаўбцоўскім раёнах Мінскай вобласці.

— Што робіцца, каб людзі прымалі рашэнне прышчапіцца? Наколькі я ведаю, у раёнах існуе дастатковая колькасць нестандартных мерапрыемстваў і падыходаў?

— Асноўны метад працы з насельніцтвам — інфармацыйна-тлумачальная работа, і тут усе сродкі добрыя. З улікам эпідэміялагічнай сітуацыі забяспечыць вочныя сустрэчы з людзьмі цяпер даволі праблематычна, бо ўсе разумеюць, што збірацца ў абмежаванай прасторы небяспечна, да таго ж яшчэ трэба выконваць сацыяльную дыстанцыю і выкарыстоўваць сродкі індывідуальнай аховы органаў дыхання.

Асноўнымі спосабамі данесці важную інфармацыю аб неабходнасці, бяспеці і мэтазгоднасці вакцынацыі сталі розныя фарматы анлайн-мерапрыемстваў, шырокае выкарыстанне друкаваных і электронных СМІ, сайтаў устаноў дзяржаннагляду, органаў выканаўчай улады, арганізацый аховы здароўя. Інфармацыя размяшчаецца на «жыроўках», у праграмах на радыё (у тым ліку ўнутраным, на прадпрыемствах) і тэлебачанні, распаўсюджваецца з дапамогай памятак, лістовак, буклетаў. Безумоўна, лепш за ўсё працуе асабісты прыклад. Таму скажу, што я і члены маёй сям'і прайшлі імунізацыю супраць каранавіруснай інфекцыі ў вясенне-летні перыяд і цяпер ужо задумваемся аб увядзенні бустэрнай дозы, або паўторнай сезоннай вакцынацыі.

— У вялікіх гарадах прышчапіцца можна ў гандлёвых цэнтрах, а ў сталіцы — нават у метро. У раёнах прышчэпачныя пункты ёсць толькі ў паліклініках?

— Не толькі. Арганізацыямі аховы здароўя ў кожным з раёнаў і горадзе Жодзіне забяспечана работа не толькі стацыянарных, але і выязных прышчэпачных брыгад. А ў Барысаве і Мінскім раёне прышчэпачныя пункты працуюць у буйных гандлёвых цэнтрах. Такія ж пункты таксама ёсць у Вілейскім, Валожынскім, Слуцкім, Маладзечанскім, Бярэзінскім і Смалявіцкім раёнах.

— Вы закранулі тэму рэвакцынацыі. Каму яна паказана? Якой вакцынай рэкамендуецца прышчапляцца і праз які тэрмін пасля курса вакцынацыі ці хваробы?

— Праз шэсць месяцаў пасля завершанага курса вакцынацыі рэкамендуецца ўвядзенне бустэрнай дозы аднакампанентнай вакцыны «Спадарожнік Лайт». Калі пасля вакцынацыі прайшло 12 месяцаў, неабходна выкарыстоўваць двухкампанентны прэпарат — у нас у краіне гэта «Спадарожнік V» або вакцына вытворчасці КНР.

— Што варта рабіць, каб рэвакцынавацца?

— Звярнуцца ў тэрытарыяльную арганізацыю аховы здароўя, там вас сарыентуюць.

— Калі чалавек вакцынаваўся «Спадарожнікам», ці можна рэвакцынавацца кітайскай вакцынай? Ці ёсць яна зараз у раёнах?

— Так, можна. Вакцына ў раёнах маецца.

— Колькі прышчэпак у такім выпадку рабіць?

— Дзве пасля заканчэння 12 месяцаў.

— Ці трэба перад гэтым вымяраць цітр антыцелаў?

— Не, такой неабходнасці няма.

— На якім тэрміне трэба вакцынавацца цяжарным?

— Зрабіць гэта пажадана падчас планавання цяжарнасці. Цяжарным жанчынам можна вакцынавацца на любым тэрміне.

— Як вакцына супраць COVID-19 спалучаецца з вакцынай супраць грыпу? Ці ёсць ужо выпадкі грыпу?

— Абмежаванняў для адначасовай вакцынацыі супраць каранавіруснай інфекцыі і грыпу няма. На тэрыторыі Мінскай вобласці лабараторна пацверджаны адзін выпадак грыпу. Дарэчы, летась ніводнага факта захворвання на грып лабараторна не пацверджана.

— У ЗША і некаторых краінах Заходняй Еўропы ўжо вакцынуюць дзяцей і падлеткаў. У Расіі ўжо з'явілася вакцына «Спадарожнік М» для вакцынацыі дзяцей. Ці можна ў нас вакцынавацца падлеткам?

— Цяпер у краіне афіцыйна вакцынавацца дазволена асобам, старэйшым за 18 гадоў. Адзначу, што любое выкарыстанне імунабіялагічных прэпаратаў праходзіць у строгай адпаведнасці з інструкцыяй і пасля прыняцця афіцыйнага рашэння на ўзроўні Міністэрства аховы здароўя, заснаванага на даных аб бяспецы прэпарату і магчымасці яго прымянення для той ці іншай узроставай катэгорыі.

Алена КРАВЕЦ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

НА ПРАВО ЗАГОТОВКИ ВИНОГРАДНОЙ УЛИТКИ

на территории Кореличского района

Предмет аукциона	**Право на заготовку и (или) закупку диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства (виноградная улитка)**
Начальная цена предмета аукциона, рублей	1 450 (одна тысяча четыреста пятьдесят рублей 00 копеек)
Сумма задатка, рублей	25 % от начальной цены – 362,50 (триста шестьдесят два рубля 50 копеек)
Условия проведения аукциона	Наличие не менее двух участников
Наличие заключения Национальной академии наук Республики Беларусь	Промысловый запас виноградной улитки на территории Кореличского района составляет общей массой 27,5 тонны, предельно допустимый объем изъятия в размере 75 процентов от промыслового запаса составляет 20,6 тонны. Заключение Национальной академии наук Республики Беларусь № 28-07/6279 от 09.11.2021 г.

1. Аукцион состоится **13 января 2022 года в 11.00** по адресу: 231430, Гродненская область, г.п. Кореличи, пл. 17 Сентября, 9 (зал заседаний). Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **06 января 2022 г. до 16.00.**

2. Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:

- заявление на участие в аукционе;
- документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет получателя – Кореличский районный исполнительный комитет, УНП 500068497, р/с BY56 AKBB 3641 5180 0018 3000 0000 ЦБУ № 411 в г.п. Кореличи ОАО АСБ «Беларусбанк» г. Минск, БИК АКВВВУ2Х (в тексте обязательно указать: *код платежа 05520*);

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Порядок проведения аукциона определяется Правилами добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, утвержденными Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. № 699 «Об утверждении Правил добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства».

4. Расходы, связанные с организацией, проведением аукциона и подготовкой документации, возмещаются победителем торгов (единственным участником торгов) сверх продажной цены предмета аукциона.

5. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения.

6. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: 231430, г. п. Кореличи, пл. 17 Сентября, 9, кабинет 54 с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. **Последний день приема заявлений – 06 января 2022 года до 16.00.**

7. Контактные телефоны (факс) в г. п. Кореличи: **801596 22224, 20873.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ (ПОВТОРНЫХ) ТОРГОВ

Организатор аукциона, оператор ЭТП	**ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: info@torgi24.by**
Продавец	**СООО «Бивер Трейд», 211260, Витебская область, г. п. Шумилино, ул. Северная, 9**

Предмет торгов:

Лот	Наименование (назначение), инвентарный номер	Начальная цена
793	Прицеп лесовоза, IN.PROIZV EP24M3PB, гос. № А5545А	6 823,07
794	Прицеп лесовоза СМТ РТ12-20, гос. № А5541А-2	10 149,10
795	Станок «Мастер ОЦ-550»	10 914,00
796	Набор шкафов и стол темно-коричневого цвета	2694,38

расположенные по адресу:
Витебская обл., Шумилинский р-н, г. п. Шумилино

Размер шага составляет **5 %** от начальной цены лота

Задаток 10 % от начальной цены предмета торгов в белорусских рублях (**для каждого лота**) перечисляется на р/с BY56UNBS3012089 3600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней после торгов

Условия оплаты предмета торгов

Победитель торгов (претендент на покупку), обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 10 (десяти) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки ООО «Расантехторг», размещенным по адресу: www.torgi24.by

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **5 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не более **1 800,00 бел. руб.**

Дата и время начала торгов: 21.12.2021 в 09.00.
Дата и время окончания торгов: 21.12.2021 в 16.00.
Торги продлеваются на 3 минуты с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 3 минуты до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: 18.12.2021 до 17.00 на ЭТП ООО «**Расантехторг**» по электронному адресу: **www.torgi24.by**

Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87.
E-mail: info@torgi24.by.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Нарвегія выступіла супраць перамяшчэнняў саюзнікаў па НАТА каля граніц Расіі

Кіраўнік МЗС Нарвегіі Аннікен Вітфельт у гутарцы з газетай VG заявіла, што новы ўрад краіны выступае супраць перамяшчэнняў саюзнікаў Осла па НАТА каля граніц Расіі і плануе іх абмежаваць.

Паводле слоў Вітфельт, для Нарвегіі важная ваенная прысутнасць у найбліжэйшых раёнах, аднак «будзе лепш, калі ў непасрэднай блізкасці ад расійскай граніцы мы будзем спраўляцца самі — з дапамогай нарвежскіх самалётаў і фрэгатаў».

Міністр адзначыла, што мае намер абмеркаваць гэтае пытанне з Вялікабрытаніяй і ЗША, паколькі «ў нарвежскіх інтарэсах клапаціцца аб абароне гэтых раёнаў самастойна, сіламі нарвежскіх узброеных сіл». Яна дадала, што цяпер прысутнасць узброеных сіл ЗША ў раёне каля граніцы з Расіяй не большая, чым у іншыя перыяды «пасляваеннай эпохі».

Токіа выплаціць грамадзянам 15,8 мільярда долараў з-за COVID-19

Улады Токіа вырашылі выдзеліць 1,8 трыльёна ен (каля 15,8 мільярда долараў) на дапамогу насельніцтву ва ўмовах пандэміі COVID-19, паведамляе TACC са спасылкай на мясцовае выданне Yomiuri.

Адзначаецца, што ўрад Японіі ўнёс гэтыя выплаты ў праект дзяржаўнага бюджэту на 2022 фінансавы год. У рамках дапамогі па 174 долары атрымаюць усе жыхары, у якіх ёсць пасведчанне асобы ў выглядзе пластыкавай карты.

Пры гэтым умовай для атрымання грошай стане згода грамадзяніна выкарыстоўваць гэтыя карты ў якасці медыцынскай страхоўкі, таксама іх неабходна прывязаць да рахунку ў банку. Такім чынам улады хочуць павысіць папулярнасць адзіных картак ідэнтыфікацыі асобы. На гэты момант імі карыстаюцца толькі 39 працэнтаў японцаў.

На Зямлі Франца-Іосіфа знік паўвостраў

Супрацоўнікі нацпарку «Руская Арктыка» падчас рэйду вакол вострава Ева-Ліў на архіпелагу Зямля Франца-Іосіфа выявілі, што амаль цалкам растаў паўвостраў, які заканчваецца мысам Месяцава.

Як высветлілі вучоныя, пасярод мыса ўтварыўся праліў шырынёй тры кіламетры. «Назіранні дазволілі зрабіць выснову, што мыс цалкам быў ледніком, частка, якая засталася ад яго, цяпер уяўляе сабой кавалак ледніка, які стаіць на водмелі. Зробленае адкрыццё патрабуе ўвагі гідраграфічнага ўпраўлення і ўнясення змяненняў у лоцыі», — прыводзяцца ў паведамленні словы дырэктара нацпарка «Руская Арктыка» Аляксандра Кірылава.

Ён адзначыў, што карта гэтага вострава была складзена ў сярэдзіне мінулага стагоддзя, зараз яна састарэла.

Бяда

СМЯРОТНАЯ ГУЛЬНЯ

За 10 месяцаў гэтага года ад перадазіроўкі наркотыкамі ў краіне загінулі 123 чалавекі

Захоўваецца тэндэнцыя амаладжэння асоб, якія ўцягнуты ў незаконны абарот наркотыкаў. Аб гэтым паведаміла начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Наталля САХАРЧУК.

— Праведзены намі аналіз паказаў: колькасць непаўналетніх, якія цяпер здзяйсняюць злачынствы ў дадзенай сферы, не змяншаецца, на жаль, адзначаецца дынаміка росту, — падкрэсліла Наталля Сахарчук. — За 10 месяцаў бягучага года супрацоўнікамі наркакантролю краіны было ўстаноўлена 96 непаўналетніх, якія здзейснілі правапарушэнне ў сферы незаконнага абароту наркотыкаў. Іх узрост — ад 14 да 17 гадоў. Прычым гэта не толькі навучэнцы тэхнагу агульнай сярэдняй адукацыі, але і студэнты ВНУ.

Як заўважыў **начальнік Галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў Алег СІЛЬВЕСТРОВІЧ,** эпідэміялагічная абстаноўка разам з іншымі абставінамі аказалі істотны ўплыў на працэсы, якія адбываюцца ў наркаасяроддзі. «Маладыя людзі сталі больш актыўна рэагаваць на прапановы лёгкага заробку, размешчаныя на шматлікіх інтэрнэт-пляцоўках, нягледзячы на разуменне незаконнасці сваіх дзеянняў, — адзначыў Алег Сільвестравіч. — Большасць асоб, якія здзейснілі злачынствы, звязаныя са збытам наркотыкаў, з'яўляюцца членамі арганізаванай злачыннай групы. А гэта, у адпаведнасці з артыкулам 328 Крымінальнага кодэкса, прадугледжвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін ад 6 да 20 гадоў».

Пагаджаючыся на прапановы наркадылераў, падлеткі часта думаюць, што ім за гэта нічога не будзе. Аднак гэта не так. Крымінальная адказнасць за збыт наркотыкаў наступае з 14 гадоў. Алег Сільвестравіч звярнуў увагу на той факт, што непаўналетнія з шэрагу спажыўцоў наркотыкаў часта пераходзяць у склад арганізаваных злачынных груп, якія займаюцца не толькі збытам наркотыкаў, але нават і арганізацыяй наркалабараторый па іх вырабе. «Метады псіхалагічнага ўздзеяння, якія выкарыстоўваюць арганізатары інтэрнэт-пляцовак па продажы наркотыкаў, становяцца больш агрэсіўнымі і ўдасканаленымі, уплываюць на свядомасць маладых людзей, — пераканаць праваахоўнік. — Асобы, якія ўцягваюць моладзь у збыт наркотыкаў, бяруць да ўвагі той факт, што моладзь усё часцей прыцягваюць лёгкія заробкі, а ў іх культуры пераважаюць карысць, ганарыстасць і самалюбства. Асабліваю занепакоенасць і трывогу выклікае тая акалічнасць, што ўжыванне наркотыкаў школьнікамі становіцца прычынай іх гібелі. Практычна штодзённа ў аддзяленні таксікалогіі ўстаноў аховы здароўя працягваюць трапляць людзі па прычыне перадазіроўкі наркотыкамі. На жаль, не ўсіх з іх удаецца выратаваць».

Вядома, што асноўным рэсурсам для распаўсюджвання наркотыкаў сёння з'яўляецца інтэрнэт. «Ніхто ніколі не бачыць тых, хто знаходзіцца па той бок камп'ютара, смартфона або іншага гаджэта, — канстатуе начальнік Галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС. — Тым не менш многія вераць у іх абяцанні і па сваім глупстве, і па наіўнасці, жадаючы атрымаць лёгкія грошы, вострыя адчуванні, часам расцэньваючы гэта як які-небудзь квэст, уступаюць у небяспечную гульню. Але гэта не гульня. Гэта асабліва цяжкае злачынства, якое прадугледжвае пакаранне. Адзіная мэта найменшкаў — асабістае абагачэнне, а лёсы, жыцці і здароўе маладых і наіўных людзей ім абыякавыя».

Алег Сільвестровіч назваў парадаксальным той факт, што большасць дарослых перакананыя, што праблема наркотыкаў закране каго заўгодна, але толькі не іх сям'ю. «Высвятляецца, што многія бацькі дагэтуль не ведаюць, што інтэрнэт і гаджэты не толькі спрыяюць развіццю дзіцяці, але і нясуць сур'ёзную пагрозу бяспецы, — канстатаваў ён. — Спрабуючы не парушыць асабістую прастору дзіцяці, не звяртаючы ўвагу на змены ў паводзінах, не ведаючы кола зносін і не ўнікаючы ў лад жыцця, таты і мамы даведваюцца аб наступствах занадта позна. Гэта не азначае, што нам неабходна засцерагчы дзіця ад інтэрнэту, ды і ў наша стагоддзе гэта наўрад ці атрымаецца. Патрэбна знайсці час на зносіны са сваімі дзецьмі, тлумачыць ім, чым небяспечныя наркотыкі, быць уважлівымі да таго, з кім кантактуе падлетак, знаходзячыся ў сацыяльных сетках. Найлепшае вырашэнне праблемы — гэта яе прадухіленне. Неабходна не шкадаваць часу для сваіх дзяцей, бо, калі адбудзецца бяда і яны трапяць у сетку наркотыку або наркадылера, спатрэбіцца значна больш часу, каб выратаваць яго».

Вераніка КАНЮТА.

Новыя магчымасці

Прававая ахова для інтэлектуальнай уласнасці

Цэнтр падтрымкі тэхналогій і інавацый адкрыўся ў БДТУ

«Міжнародны праект па стварэнні і развіцці сеткі цэнтраў падтрымкі тэхналогій і інавацый выконваецца ў Беларусі сумесна з Сусветнай арганізацыяй інтэлектуальнай уласнасці. Яго асноўная мэта — стымуляванне інавацыйнай дзейнасці, а таксама забеспячэнне інфармацыйнай і навукова-метадычнай падтрымкай карыстальнікаў паслуг цэнтраў у сферы навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці», — расказалі ў прэс-службе Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях.

Да апошняга часу ў Беларусі працавала 14 цэнтраў падтрымкі тэхналогій і інавацый: па адным у Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэцы, яе абласных філіялах, у Беларускім дзяржаўным універсітэце, Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, Палескім дзяржаўным універсітэце, Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі, у індустрыяльным парку «Вялікі камень», Полацкім дзяржаўным універсітэце, Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэце і Нацыянальным цэнтры інтэлектуальнай уласнасці.

Рэктар Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Ігар ВОЙТАЎ адзначыў, што стварэнне ва ўніверсітэце Цэнтра падтрымкі тэхналогій і інавацый дазволіць актывізаваць дзейнасць і павысіць якасць работы ў галіне прававой аховы, інфармацыйнага забеспячэння і выкарыстання інтэлектуальнай уласнасці, аказання паслуг у навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай сферах, а таксама пашырыць міжнароднае супрацоўніцтва ў рамках Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

«Са «Звяздой» цяплей»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Са «Звяздой» цяплей» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі тэрмінам з 7 снежня 2021 года да 31 сакавіка 2022 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2022 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Са «Звяздой» цяплей» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда», — і складаецца з наступных рэчаў:

№ п/п	Назва	Колькасць (шт.)	Цана за шт. руб.	Стаўка ПДК, %	Сума ПДК, руб.	Усяго з ПДВ, руб. кап.
1	Электрасамавар Kelli KL — 1322 (далей — суперпрыз)	1	155,00	20 %	31,00	186,00
2	Тэрмас універсальны для ежы і напояў 1 л, нержавеючая сталь, ARIZONE (далей — Прыз)	7	34,26	Без ПДК	Без ПДК	239,82

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Са «Звяздой» цяплей» складае: 425,82 (чатырыста дваццаць пяць) рублёў 82 капейкі.

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Са «Звяздой» цяплей» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2022 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2022 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 7 снежня 2021 года да 16 студзеня 2022 года выраззаная з газеты або з дадатковага ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 7 да 31 снежня 2021 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі Установе пасля 16 студзеня 2022 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні «Са «Звяздой» цяплей» Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна, намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна, начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Ганцарэвіч Святлана Міхайлаўна, загадчык аддзела рэалізацыі рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна, рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда»;

Брашко Алег Мікалаевіч, загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАМ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 21 студзеня 2022 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 прызоў (па адным для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца, і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў Прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны Прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 29 студзеня 2022 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 29 студзеня 2022 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным Прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

16. Умовай выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2022 года.

Пры звяртанні па атрыманне Прыза або Суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне Прыза або Суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2022 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў Прыз або Суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2022 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму Прыза або Суперпрыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін да 31 сакавіка 2022 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, з панядзелка да суботы (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам гульні па тэлефоне (017) 263 66 73, 311 17 40 для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне Прыза або Суперпрыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 31 сакавіка 2022 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковаі справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем Прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Са «Звяздой» цяплей» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 271 81 53, 311 17 40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4117 ад 30.11.2020 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Наталля МАРЫНАВА:

«Ацэньваць цікавасць да фільма па колькасці гледачоў у зале не варта»

НАПРЫКАНЦЫ восені беларуская сталіца традыцыйна ладзіла для кінатворцаў і іх прыхільнікаў спатканне на ММКФ «Лістапад». У межах яго, як мы ўжо пісалі, адбылося шмат цікавых прэм'ер, сустрэч і майстар-класаў. Вынікі падведзены і пераможцы ўзнагароджаны, аднак хочацца даведацца пра тое, што засталося за кадрам. У прыватнасці, больш падрабязна пагаварылі пра дакументальнае кіно са старшынёй журы сёлетняй конкурснай праграмы і дырэктарам тэлеканала «Беларусь 3» Наталляй Марынавай.

Фота дадзена Белтэлерадыёкампаніяй.

Наблізіцца да аўдыторыі, не паніжаючы планкі

— Наталля Васільеўна, вынікі «Лістапада» мы ўжо ведаем. Якія ўражанні пакінуў у вас прагляд конкурснай праграмы дакументальнага кіно?

— Сёлета на фестывалі было прадстаўлена 17 карцін дакументальнага кіно. Радуе, што ўсе работы розныя. Сярод іх і прыклады, можна сказаць, старой класічнай школы, і працы, за якімі, думаю, будучыня. Фільм турэцкага рэжысёра Ензара Алтая «Кадакушы» і «Ціхая спадчына» Пеці Накавай з Балгарыі — гэтыя кінастужкі імкнуцца наблізіцца да масавага гледача, не губляючы творчага патэнцыялу самога фільма і яго мастацкай каштоўнасці. Абедзве работы належаць маладым аўтарам. І такая форма дакументальнага назірання з дакладна выбудаванай сюжэтнай лініяй, мне здаецца, будзе карыстацца папулярнасцю. Згаданыя фільмы журы адзначыла спецыяльнымі прызамі. А вось што датычыцца фільма «Далёкі план» Уладзіміра Галаўнёва (Расія), які атрымаў Гран-пры, то там вельмі цікавая і іранічная праца. Сам рэжысёр казаў, што перажываў, як успрымуць яго стужку ў Міністэрстве культуры, але яго здзівілі, калі не толькі прынялі, але і падтрымалі. Я таксама здзівілася, бо фільм на злобу дня і разам з тым там паўсюль чытаецца іронія, што робіць стужку актуальнай і добрай гісторыяй.

Акрамя гэтага, некаторыя работы мы адзначылі таксама дыпломамі, таму што, сапраўды, праграма дакументальнага кіно была ў гэтым годзе багатай на цікавыя гісторыі, якія зроблены па-рознаму. Напрыклад, тая ж расійская стужка «Народжаны на Неўскім пятачку» Яўгенія Папова — таксама работа маладых людзей, якую цікава паглядзець і на фестывалі, і нават у тэлеэфіры. Сярод цікавых і фільмы «Балада пра Галілея» (Ралітза Дзімітрава, Балгарыя), і грузінскія «Роварам да Месяца» Георгія Харэбавы, і «МШТ-15: Анёл шчасця» Вахтанга Кунцава-Габашвілі. А работа іспанскага рэжысёра Альгіса Арлаўскаса «Вольны палёт» нават нечым мне нагадала фільм Міхалкова «Ганна: ад 6 да 18».

— Калі і ўвогуле ці варта чакаць трансляцыі дакументальных фільмаў з кінафоруму на «Беларусь 3»?

— Плануем правесці работу ў дадзеным кірунку. Датычна фільмаў, якія былі прадстаўлены на «Лістападзе», ёсць пэўныя складанасці, звязаныя менавіта з працэсам перагавораў з уладальнікамі правоў на іх. Бо, напрыклад, калі фільм плануе ў далейшым прымаць удзел у фестывалях класа А, то нам ніхто не дазволіць трансляваць яго ў тэлеэфіры. Але папярэдне мы правялі перагаворы з некаторымі аўтарамі і сышліся на тым, што будзем супрацоўнічаць у гэтым напрамку. Таму спадзяюся, што некаторыя дакументальныя фільмы сёлетняга «Лістапада» ўбачаць і гледачы «Беларусь 3».

— Згаданыя вамі 17 фільмаў даюць пэўны зрэз таго, што сёння ўяўляе сабой дакументальнае кіно. Якія ў яго асаблівасці, характарыстыкі на сучасным этапе, калі меркаваць па ўбачаным?

— Ведаеце, я чакала, што складаны 2020 год унясе нейкія карэктывы ў тэматыку фільмаў. Аднак, нягледзячы на разнастайнасць сюжэтаў, там не знайшлі адлюстравання ні пандэмія, ні нейкія грамадска-палітычныя падзеі. Адзінае — аўтары адзначалі, што гэты час даў ім магчымасць нарэшце спакойна сесці і зманціраваць той матэрыял, які быў зняты і чакаў дапрацоўкі. Іх па-ранейшаму хвалююць пачуцці чалавека, адносіны бацькоў і дзяцей, тэма адзіноты... Але, калі казаць пра фільм «Сонунку/Апошні» Фарыза Ахмадава (Азербайджан), то там адзінота тая, да якой усе мы звыклі і ведаем. А вось у «Кадакушах» — гэта ўжо праблема XXI стагоддзя. І ў стужцы яна па-новаму разглядаецца. Зараз гэтая тэма актуальная ў Японіі, у развітой краіне. Праблема смерці адзінокіх пажылых людзей прымушае гледача задумацца і нават шкадаваць, што з улікам усіх магутнасцяў тэхнічнага прагрэсу людзі паміраюць пры такіх абставінах. Бо «кадакушы» — гэта калі чалавек памёр, а яго доўга не знаходзяць. І падчас прагляду фільма ты ўсведамляеш не проста з'яву, а яе маштаб, калі ў краіне існуюць асобныя службы па доглядзе састарэлых і клінінгавыя службы, якія прыбіраюць кватэры тых, хто сышоў з жыцця... То-бок, адлюстравана не проста праблема, знойдзеная рэжысёрам, а цэлая сістэмная сітуацыя.

Кіно, схаванае ў дэталях

— Асобна давайце спынімся на беларускім фільме Галіны Адамовіч «Страла», які таксама атрымаў некалькі ўзнагарод, у тым ліку і «Прыз сімпатый гледачоў». Якое ўражанне гэтая кінастужка дае пра айчынную дакументалістыку на міжнародным фоне?

— Гэта добрая і актуальная работа, і яна вельмі годна выглядала на фоне ўсіх прадстаўленых фільмаў. Нават з улікам таго, што пра абрад «Страла» ведаюць многія, прынамсі ў Беларусі, фільм уразіў маіх калег з журы. Іх зацікавіла аўтэнтычная беларуская гісторыя. Дадзеная кінастужка зусім іншай накіраванасці ў адрозненне ад яе папярэдняга фільма «Добрых дзяўчат не б'юць». Хоць мае студэнты на факультэце журналістыкі БДУ, якія глядзелі абодва фільмы, выказваюць цікавую ідэю, што «Страла» — гэта гісторыя, што адбываецца потым з пакаленнем гераінь «Добрых дзяўчат не б'юць». Яны бачаць узаемасувязь таго, як дазвалялі з сабой абыходзіцца жанчыны ў мінулым, і наступстваў, якія мы пасля назіраем у жыцці іншых пакаленняў. Але для мяне «Страла» — фільм перш за ўсё пра людзей, нават з улікам таго, што там паказаны традыцыйны беларускі абрад, і гэтая тэма не аднойчы ўжо ўвасаблялася на экране. Фільм перспектыўны, бо, як адзначала журы (яны з'яўляюцца адборшчыкамі кінастужак на розныя фестывалі), тэмы фальклору і нацыянальнай ідэнтычнасці зараз вельмі запатрабаваныя. Таму, думаю, у «Стралы» будзе ў тым ліку і добрае фестывальнае жыццё.

— Наколькі я ведаю, вы глядзелі фільмы разам з гледачамі на фестывалі. Можаце прыгадаць, якія з іх сабралі найбольшую колькасць наведвальнікаў?

— Больш за ўсё людзей прыходзіла на прагляды тых кінастужак, якія прадстаўлялі іх стваральнікі. Максімальнай на колькасці была аўдыторыя на прэм'ерным паказе фільма «Іншым я ўжо не буду» рэжысёра Антона Нікалаева (Расія). На творчай сустрэчы там прысутнічаў сам Мікалай Бурляеў, пра якога і зняты фільм. А ў цэлым, калі казаць пра наведванне паказаў, то запаўняльнасць залы залежала і ад часу сеансаў. У будніх дні, вядома, больш людзей прыходзіла на познія сеансы. Аднак я думаю, што ацэньваць цікавасць да фільма па колькасці гледачоў у зале складана і не варта. Важна, што пасля кожнага сеанса была рэакцыя ад аўдыторыі: мы чулі апладысменты, да журы падыходзілі людзі, і мы з імі абмяркоўвалі пабачанае на экране. Гледачы былі падрыхтаваныя: разумелі кантэкст, імкнуліся шукаць прычынна-выніковыя сувязі, таму працаваць было цікава.

— Зараз назіраецца пэўная тэндэнцыя ў кінаіндустрыі, калі кіно сыходзіць на інтэрнэт-платформы. І ў сувязі з гэтым хочацца спытаць, як адрозніваюцца адчуванні і ўспрыманне кінафільмаў з экрана манітора і на вялікім экране?

— Складана прадказаць, як усё будзе развівацца, але вялікае кіно і ў тым ліку дакументальнае (што было прадстаўлена на «Лістападзе») трэба глядзець пры магчымасці на вялікім экране. Адчуванні, калі глядзіш фільм у кінатэатры, ні з чым не параўнальныя. Ты паглыбляешся ў атмасферу фільма, і тады зусім іншае ўспрыманне карцінкі, гуку і герояў. У дачыненні да дакументальнага кіно вельмі важна, каб нішто не адцягвала вашай увагі. Таму што гэта не серыял, які можна паглядзець фонам і нічога не страціць. У дакументальнай кінастужцы вельмі важна не прапусціць нешта. Бо ў іх, як правіла, не бывае нічога выпадковага: кожны план, кадр і дэталь — усё прадумана і нясе сэнс. І калі ты ўлоўліваеш такія аўтарскія інтанацыі, то зусім па-іншаму ўдаецца «прачытаць» кінаработу. Калі ёсць магчымасць ісці і глядзець кіно на вялікім экране, то рабіце гэта.

«Я чакала, што складаны 2020 год унясе нейкія карэктывы ў тэматыку фільмаў. Аднак, нягледзячы на разнастайнасць сюжэтаў, там не знайшлі адлюстравання ні пандэмія, ні нейкія грамадска-палітычныя падзеі. Адзінае — аўтары адзначалі, што гэты час даў ім магчымасць нарэшце спакойна сесці і зманціраваць той матэрыял, які быў зняты і чакаў дапрацоўкі. Іх па-ранейшаму хвалююць пачуцці чалавека, адносіны бацькоў і дзяцей, тэма адзіноты...»

Фільмы, якія чакаюць і абмяркоўваюць

— Магчымасць глядзець добрае кіно на вялікім экране, за выключэннем раённых і абласных гарадоў, беларусам выпадае нячаста. Ці ўлічваеце гэта, напрыклад, фарміруючы сетку вяшчання сацыякультурнага тэлеканала?

— Калі казаць пра дакументальнае кіно, то мы добра разумеем, што гэта не камерцыйная гісторыя: рэклама там не размяшчаецца, і нікому тое не выгадна. То-бок, тут маем цэлы ланцужок пэўных праблем, якія існуюць у сучасным грамадстве, распешчаным масавай культурай. Дакументальны фільм ніколі не збярэ такой жа колькасці гледачоў, як ігравая кінастужка, таму ў мяне няма адносна гэтага ніякіх ілюзій. Аднак я перакананы, што ёсць аўдыторыя, якая любіць і чакае менавіта такое кіно. І дзейнасць «Беларусь 3» накіравана ў тым ліку і на тое, каб у гэтых людзей была магчымасць спрычыніцца да такіх фільмаў. Што да айчыннай дакументалістыкі, то мы імкнёмся паказваць усё, што створана на кінастудыі «Беларусьфільм», супрацоўнічаем з Уладзімірам Бокунам, які таксама працуе ў дадзеным напрамку. Будзем і далей паказваць дакументальнае кіно, нават не чакаючы высокіх доляў тэлепраглядаў, бо гэта тыя гісторыі, якія прымушаюць думаць, супераджываць і рабіць высновы.

— Вяртаючыся да фестывальнай тэмы, што ўсё ж важней для дакументальнага кіно — ацэнка міжнародных кінафорумаў альбо любоў гледачоў?

— Ёсць аўтары, якія робяць фільмы для сябе ці для паказу на фестывалях. І, лічу, нам пашчасціла, што ў праграме дакументальнага кіно «Лістападу» не было кінастужак з дадзенай катэгорыі. Бо перакананы, што кіно ствараецца для гледачоў. Яго павінны глядзець і абмяркоўваць. Вядома, існуе і аўтарскае кіно, калі сам стваральнік лічыць, што зрабіў нешта выключнае і меркаванне іншых яму не важна. Але ў кожнага мастацтва свой глядач. І ён знойдзе фільм і на кінафестывалі, і ў тэлеэфіры, калі кіно па-сапраўднаму цікавае.

Алена ДРАПКО.

Васіль Ткачоў пра пісьменнікаў Гомельшчыны:

«Мне заўсёды шанцавала на добрых людзей»

Літаратура не бывае правінцыяльнай і сталічнай, яна бывае таленавітай і не... Заўсёды ў рэгіёнах жыло шмат выдатных пісьменнікаў, кожнага класіка натхняла яго малая радзіма.
Праслаўлялася літаратарскімі імёнамі і Гомельшчына. Пра сустрэчы з адметнымі асобамі, якія там жылі і працавалі, распавядае вядомы пісьменнік, драматург, гумарыст, сённяшні гамяльчанін Васіль ТКАЧОЎ.



Іван Шамякін і Сцяпан Александровіч на Гомельшчыне.

Пра Івана Шамякіна

— Сам я равеснік дачкі Івана Пятровіча, Таццяны, а пра гэта, дарэчы, згадаў і Шамякін на маім творчым вечары ў Доме літаратара, куды, на маё здзіўленне, патрыярх нашага прыгожага пісьменства завітаў і папрасіў слова... Было гэта ў лютым 1995 года. Тое слова потым гучала па рэспубліканскім радыё, Уладзімір Дзюба зрабіў перадачу. Тут, у нашым пісьменніцкім доме, і адбываліся, як правіла, нашы кароткія сустрэчы. І не было яшчэ такога выпадку, каб, запрыкмеціўшы мяне, Іван Пятровіч не падышоў, не пацікавіўся: «Ну, як там наша Гомельшчына?» А неяк народны пісьменнік запрасіў мяне да сябе на кватэру — «на кубачак кавы». Мы і сапраўды пілі каву і гаманілі.

Іван Шамякін з жонкай Марыяй Філатаўнай на Гомельшчыне.

Менш пра літаратуру, больш — пра жыццё, пра родную нам Гомельшчыну.

Да літаратуры, згадваў Іван Пятровіч, сур'ёзна ставіўся яшчэ ў школьныя гады. Перачытваў усё, што траплялася пад рукі. Набіраўся смеласці, прасіў кніжкі то ў дырэктара, то ў настаўнікаў, хоць і ў іх запас быў не надта... Нешта спрабаваў і сам пісаць. Больш вершы. Не трэба тлумачыць, пра што... А ўжо калі трапіў у Гомель, то даведаўся, што пры «Гомельскай праўдзе» працуе літаб'яднанне. Пачаў яго наведваць.

Там панавала таварыская атмасфера. Хоць і сустракаліся аматары паддаць перцу без дай на тое прычыны. У газеце, прыгадваў класік, працаваў Яўменаў, сам не літаратар, але любіў, калі гуртаваліся вакол газеты маладыя паэты, празаікі. Разам з Іванам Шамякіным наведвалі тыя заняткі будучыя вядомыя паэты Кастусь Кірэенка, Дзмітрый Кавалёў, Леанід Гаўрылкін. Яны крыху старэйшыя былі за яго, ужо друкаваліся. І ці трэба гаварыць, як ён ім зайздросціў? Неяк, прызнаўся Іван Пятровіч, разбіраў свае рукапісы на дачы і натрапіў на абадраны сшытак, юнацкі дзённік за сакавік — май 1939 года. Дык вось, у ім ён вычытаў, як у гуртку раз-біралася яго апавяданне. Шкадаваў, што чамусьці не пазначыў, як яно называлася, а памяць назву не зберагла. Яго раскрытыкаваў нейкі Мікула... Хто ён такі — нават у твар не запомніў... Усіх запомніў, а яго — не... Але ён не ўнік у тое, што малады Іван Шамякін напісаў, і таму гаварыў непераканаўча.

Пра Івана Сяркова

— Гэта дзякуючы яму я трапіў у Каралішчавічы (разам з Анатолем Сысам) на нараду маладых пісьменнікаў. А пазней, калі ў Магілёўскім абласным драматычным тэатры была пастаўлена драма «Сівы бусел» па маёй першай п'есе, ён сказаў мне прыкладна так: «Магіляўчане спектакль паглядзелі, а чым мы, гамяльчане, горшыя? Дай мне тэлефон дырэктара тэатра, распытаю, што там атрымалася за цацка, калі ўсе газеты пішуць?» Я даў нумар тэлефона светлай памяці Алы Паўлаўны Барысавай, яна была не толькі дырэктарам тэатра, але і выконвала ў спектаклі адну з галоўных роляў. І неўзабаве магіляўчане прыехалі на гомельскую студыю і запісалі спектакль.

Толькі ж не гэтым, мабыць, запомніўся мне Іван Сяркоў, у першую чаргу сваёй патрабавальнасцю, прынцыповасцю. А справа вось у чым. Ужо выйшла і праграмка абласнога тэлебачання, дзе асобным тэкстам паведамлялася, што перад пачаткам спектакля выступіць сам драматург. А драматург не выступіў. «Што ты мямліў? Як дзіця. Не, не будзем даваць твой уступ. Не салідна для драматурга... Разгубіўся, словы глытаеш...» — такі прысуд зрабіў Сяркоў. За што я толькі ўдзячны яму: ён навучыў мяне думаць перад камерай.

Пазней я вёў на тэлебачанні «Літаратурную гасцёўню», яна ішла ў прамым эфіры, а я, седзячы ў студыі, адчуваў прысутнасць побач галоўнага рэдактара тэлебачання Івана Кірэевіча Сяркова, які, ведаў, за ўсім гэтым сочыць у сваім кабінеце: тэлевізар у яго быў заўсёды ўключаны, і калі ішлі тракты альбо трансляваліся перадачы гомельскай студыі, ён прыліпаў да экрана. Мабыць, нерваваўся. Мабыць, радаваўся ўдачы. І ў такія хвіліны шмат курыў. Звычайна «беламорыну».

Ніколі пасля перадачы не хваліў, але і не папракаў. Відаць, у душы недзе ён і радаваўся, што выразаў тады мяне з эфіру: на карысць пайшло чалавеку...

Неяк Іван Сяркоў расказаў, як стаў ён пісьменнікам. Ці не ў той час гэта было яшчэ, калі працаваў у гомельскай раённай газеце «Маяк», яна месяцца і да сённяшняга дня ў Навабеліцы. Насупраць будынка рэдакцыі быў якраз «Блакітны Дунай», там прадавалася заўсёды свежае піва, і таму іншы раз журналісты з горада прыязджалі сюды, каб не толькі апаражніць па куфлі напою, але і пра жыццё пагаманіць. Ціха, утульна, а галоўнае — падалей ад вока начальства. Газетчыкі і тэлевізійшчыкі смакавалі піва, байлі байкі. Асабліва ўдаваліся байкі Сяркову. Леанід Гаўрылкін (ён працаваў ужо на тэлебачанні, пераехаў з Церахоўкі, дзе пасля ўніверсітэта рабіў у раёнцы) і параіў тады яму пісаць, сур'ёзна заняцца літаратурнай творчасцю.

Падштурхнуў, адным словам.

Сустракаю Івана Кірэевіча на тэлестудыі, выгляд не надта каб.

З Масквы ўчора патэлефанавалі, ноч не спаў: там Санька памёр...

«Мы з Санькам у тыле ворага»...

Пісьменнік не прыдумаў Саньку. Дружбакамі заставаліся яны ўсё жыццё.

Паэт і рэдактар на той час «Тэлефільма» Раман Тармола расказваў мне, здзіўляючыся прынцыповасці Івана Сяркова: «Сцэнарый кінафільма па аповесці «Мы — хлопцы жывучыя» Іван Сяркоў напісаў сам. У ходзе работы над фільмам рэдактары прымушалі яго змяніць некаторыя мясціны. Сяркоў наадрэз адмовіўся і запіхаў сцэнарый у сумку, чым даў зразумець: не згодны — не трэба. Рэдактура адступіла, а мы пачалі яшчэ больш паважаць Івана Кірэевіча. Звычайна аўтары сцэнарыяў заяўлялі: «Я сваё напісаў, а далей што хочаце, тое і рабіце».

Сяркоў валодаў рэдкім дарам — пісаць з гумарам пра сур'ёзныя рэчы. На вялікі жаль, гэты дар быў скарыстаны не да канца. Не слухалася правая рука, рэдкія запісы рабіла жонка. Аслаб зрок.

І ў той месяц, калі пісьменніка не стала, я прыехаў да яго.

Калі развіваліся, нейкая сіла пацягнула мяне тады да яго, мы абняліся. Аказалася — развіталіся назаўсёды... Больш я Сяркова не бачыў. Акрамя як у труне. Яе ўстанавілі на студыі тэлебачання. На вачах усіх, хто ведаў Івана Кірэевіча, я бачыў слёзы: так развітваюцца звычайна з роднымі, блізкімі людзьмі...

Пахавалі пісьменніка ў Пакалюбічах, на пагорку, з якога адкрываюцца надзвычай прыгожыя мясціны — шырокі луг, люстра Сожа...

Іван Кірэевіч пакінуў нам цудоўныя аповесці «Мы з Санькам у тыле ворага», «Мы — хлопцы жывучыя» і «Мы з Санькам — артылерысты», якія вельмі палюбіліся чытачам. Над назвай апошняй аповесці мы думалі разам. Круцілася ў нашых галовах і такая: «Мы з Санькам — салагі». Усё ж апошняе слова было за аўтарам.

Іван Сяркоў з выканаўцам галоўнай ролі ў фільме «Мы — хлопцы жывучыя».

Пра Уладзіміра Верамейчыка

— «Я не ў тылах, я не завяў (нехай нікому не здаецца). Я правільны акоп заняў, як падказала маё сэрца», — напісаў у адным з вершаў Уладзімір Верамейчык.

Творчы лёс Уладзіміра Верамейчыка склаўся ўдала. У дваццаць гадоў малады паэт, салдат на той час, быў выкліканы з Арменіі на нараду маладых пісьменнікаў у Каралішчавічы. На імя камандзіра часці прыйшла адпаведная тэлеграма за подпісам Петруся Броўкі. Гэта дапамагло.

Прыхільна былі сустрэты першыя спробы пяра Уладзіміра Верамейчыка. Вось як пра той шчаслівы час напісаў паэт у сваёй аўтабіяграфіі: «На адзін дзень я ўсё ж спазніўся. Да ўдзельнікаў семінара далучыўся ў музеі Янкі Купалы, там упершыню сустрэўся з жонкай вялікага песняра — Уладзіславай Францаўнай. Разам са мной ехалі Уладзімір Караткевіч, Еўдакія Лось, Генадзь Бураўкін, Рыгор Барадулін, Юрась Свірка і іншыя. Кожны дзень ішло абмеркаванне творчасці таго ці іншага паэта. Пра мае творы дакладваў Васіль Вітка, і былі, на мой погляд, сустрэты яны прыхільна. Кастусь Кірэенка, які працаваў у часопісе «Беларусь», падышоў да мяне і папрасіў некалькі вершаў. Потым чатыры з іх былі надрукаваны ў «Беларусі», і Бураўкін прыслаў мне часопіс у Кіравакан. Радасці маёй не было мяжы...»

Уладзімір Верамейчык.

Служба яшчэ працягвалася, а малады паэт жыў думкамі пра БДУ імя У. І. Леніна, куды вырашыў паступіць. Паспяхова здаў уступныя экзамены, стаў студэнтам філалагічнага факультэта. Гады вучобы праляцелі хутка. Уладзімір Верамейчык папрасіўся на Палессе — туды, дзе нарадзіўся, дзе вырас. На ўсё жыццё заставаўся верны вёсцы, дзецям, якіх вучыў да канца свайго жыцця ў Ведрыцкай школе Рэчыцкага раёна.

Я нярэдка па яго прапанове выступаў перад вучнямі гэтай школы. Уладзімір Міхайлавіч, згадваю, смяяўся нароўні з дзецьмі, калі я апавядаў нешта вясёлае, іншы раз толькі закрываў твар далоняй. Відаць, хацеў перад вучнямі выглядаць як заўсёды строгім і патрабавальным. А неяк расказаў, як запрасіў ён на сустрэчу пісьменніка-казачніка з Рэчыцы, той зацікавіў аўдыторыю, а гэта былі малодшыя школьнікі, а калі раптам заспяваў, то дзеці спалохаліся і некаторыя нават схаваліся пад сталы...

Гумарыст Уладзімір Міхайлавіч быў яшчэ той!

Не стала Уладзіміра Верамейчыка ў 1999 годзе. Ён пакінуў нам некалькі паэтычных кніг, зборнік гумарэсак, кнігу нарысаў... І добрую памяць пра сябе.

Мне заўсёды, скажу шчыра, шанцавала на добрых людзей.

Пра землякоў з Гуты

— Праект «Мы — родам з Гуты» пачаўся не з мяне. Трэба сказаць дзякуй земляку і стрыечнаму брату Васілю Касакову, ён жыве ў Кіеве, капітан першага рангу ў адстаўцы, кандыдат гістарычных навук. А я ўжо як магу дапамагаю гэтаму апантанаму чалавеку. А ў нашай вёсцы жылі добрыя людзі, многія не вярнуліся з вайны. Захаваць памяць пра іх — наша задача. Так, я планую ў найбліжэйшы час паставіць на могілках стэлу-помнік, на якой будуць прозвішчы ўсіх землякоў, якія знайшлі свой апошні прытулак далёка ад бацькоўскага кутка. Калі мы гэта не зробім сёння, то хто зробіць заўтра? Такіх людзей трэба помніць. Дарэчы, Гута ганарыцца сваім ураджэнцам Героем Савецкага Саюза, гвардыі генерал-маёрам Піліпам Ерафеевічам Жгіровым... Недзе пад Санкт-Пецярбургам пахаваны і мой дзядзька Васіль Данілаў, у гонар якога я і нашу сваё імя. Прадбачу той час, калі і яго прозвішча ўбачу на стэле...

Запісала
Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«21 день к здоровью питомца и призам»

Сведения о Рекламной игре:
Наименование Рекламной игры:
«21 день к здоровью питомца и призам».

Территория проведения: Республика Беларусь.
Период проведения:
с 1 октября 2021 г. по 17 декабря 2021 г.

В Рекламной игре принял участие 401 участник.
Призовой фонд Рекламной игры разыгран полностью.

Обладателями 7 (семи) призов «Вертикальный пылесос Dyson SV10 Animal+ / V8 Animal+ и денежные средства в размере 111,89 белорусских рублей» стали:

№	ФИО	№	ФИО
1	Ермаков Виталий Витальевич	5	Рыбинская Алеся Леонидовна
2	Кулагина Ольга Павловна	6	Малахов Александр Сергеевич
3	Капустина Ксения Андреевна	7	Малахов Александр Сергеевич
4	Прохоренко Лидия Анатольевна		

Обладателями 7 (семи) призов «Мультистайлер Dyson Airwrap HS01 с длинными цилиндрическими насадками и денежные средства в размере 250,86 белорусских рублей» стали:

№	ФИО	№	ФИО
1	Филиппович Елена Николаевна	5	Кривякина Ирина Ивановна
2	Сырцова Ирина Владимировна	6	Петроченко Анжела Алексеевна
3	Василевский Игорь Владимирович	7	Петухова Дарья Фёдоровна
4	Капустина Ксения Андреевна		

Обладателями 7 (семи) призов «Очиститель воздуха Dyson HP05 Pure Hot + Cool и денежные средства в размере 250,86 белорусских рублей» стали:

№	ФИО	№	ФИО
1	Демидко Андрей Олегович	5	Волкова Людмила Витальевна
2	Худолей Ульяна Юрьевна	6	Малахов Александр Сергеевич
3	Марченко Дмитрий Васильевич	7	Романишко Анастасия Владимировна
4	Гриб Алёна Анатольевна		

Организатором Рекламной игры является ООО «ТДИ ПРОМО-ИВЕНТ», 220034, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Краснозвёздная, 18Б, 2-й этаж, пом. 5, УНП 190771520.

Свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры № 4063 от 20.08.2021, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры +375173887686 с 9.00 до 21.00 без выходных, сайт **promoone.by.**

Правила проведения Рекламной игры опубликованы в газете «Звязда» № 186 от 28.09.2021.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **ОАО «Житковичлес»** (УНП400049968), 247960, Гомельская обл., г. Житковичи, ул. К. Маркса, 80, тел. 8 (02353) 2-18-74.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **17 декабря 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

№ п/п	Предмет торгов	Где находится	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ-5-11, гос. № 4548-3 ЕК, 2018 г. в.	1	22223,16
2	Автомобиль МАЗ 6303-А8, гос. № АЕ 7921-3, с манипулятором гидравлическим М-75-04, 2010 г. в.	1	25001,06
3	Прицеп МАЗ 837810 (022), гос. № А 4816 А-3, 2010 г. в.	1	6944,738
4	МАЗ-5551 Самосвал, гос. № АВ 33-55-3, 1991 г. в.	1	6170,4
5	Автомастерская ЗИЛ 131 ПРМ, гос. № АІ 3858-3, 1990 г. в.	1	3958,37
6	Автомашина УРАЛ 4320-3, гос. № ЕМ 6265, 1996 г. в. (без постановки на учет) с Гидроманипулятором ПЛ 70-02, 2002 г. в.	1	5000
7	Автомобиль УАЗ*390945*330 № двиг. 409100*B3044904, № шасси 330360B0459912, гос. № АІ 1144-3, 2010 г. в.	1	5049
8	Легковой автомобиль «Фольксваген Пассат», гос. № 2054 ВС-3, 1998 г. в.	1	3500
9	Полуприцеп УПП1212, 1993 г. в. (без постановки на учет)	1	500
10	Газ 53Автоцистерна АЦ-4.2, гос. № АА 9628-3, 1983 г. в.	1	5000
11	Автомобиль УАЗ-452, гос. № 7844-3 АО, 1980 г. в.	1	3000
12	МАЗ-53336 (бортовая), гос. № АК 21-49, 1991 г. в.	1	5500
13	Прицеп бортовой МАЗ 8926, гос. № 3785 АА, 1993 г. в.	1	1500
14	Автопогрузчик (львовский), 1990 г. в., инв. № 000260	2	3000
15	Автомобиль Урал-375, гос. № 0813-3 АМ, 1980 г. в., (без постановки на учет)	1	5000
16	Брусующий станок TS 52-2R, инв. № 231	2	10658,53
17	Многопильный станок DS-55-IR, инв. № 233	2	10125,1
18	Вентилятор ВЦП6-45 № 8 с дв. 30/1500люб. вращения ХВ, инв. № 238	2	1687,68
19	Пилорама РПМ -02-К б/у, инв. № 397	2	3937,61
20	Станок строгальный 4х сторон, инв. № 45 Т	2	5625,28
21	Станок Ц-6-2, инв. № 54 Т	2	675,07
22	Станок ШЛД-6, инв. № 56 Т	2	1125,42
23	Лесопильная рама ЛРВ-1 № 6951, инв. № 514	2	5343,7
24	Станок брусовочный двухвальный	1	10658,43
25	Вентилятор ВЦП 7-40 № 8 без эл. дв., инв. № 565	2	1125,42
26	Молот пневматический, инв. № 000885	1	2664,59
27	Мотопомпа, инв. № 001427	1	500
28	Станок многопильный деревообрабатывающий ЦМР-3 с рольгангами не приводными 3.000 (2 шт.), инв. № 563	1	4986,36
29	Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ-5-11, гос. № 5460-3 ЕК	1	29925
30	Бензопила MS361№ 183864091	1	393,78
31	Бензопила MS361 № 172157104	1	393,78

Местонахождение:
1 – Гомельская обл., г. Житковичи, ул. Комсомольская, 45а,
2 – Гомельская обл., Житковичский р-н, п. Хвоенск.

Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.

Для участия в торгах необходимо в срок с 06.12.2021 г. 09.00 по 16.12.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 06.10.2021 г.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5**
Продавец	**Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пл. Базарная, д. 13**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов

Лот № 1 (одним лотом)
Адрес: **Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Пугачева, д. 1, 1/1 – 1/3**

Наименование (назначение)	Общ. пл.	Инвентар. номер
Здание специализир. иного назначения (АБК)	1565 кв. м	640/С-25904
Здание специализир. иного назначения (производственный корпус)	3194,6 кв. м	640/С-25908
Здание специализир. иного назначения (здание механической мойки)	293,4 кв. м	640/С-25911
Здание специализир. иного назначения (здание автозаправочной станции)	31,9 кв. м	640/С-25949

***Сведения о земельном участке**:* пл. **1,9846** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов администрат. назначения. Ограничения (обременения): расположен на природ. территориях, подлежащих спец. охране (в зоне санит. охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санит. охраны в местах водозабора)

Обременения: площади зданий с инв. № 640/С-25904 и 640/С-25908 частично сданы в аренду

Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 1 137 120,00 бел. руб.

Лот № 2 (одним лотом)
Адрес: **Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пер. Железнодорожный 1-й, 21/1 – 21/3**

Склад 1978 г. п.	570,9 кв. м	640/С-59616
Склад 1954 г. п.	648,5 кв. м	640/С-59618
Бытовка 1978 г. п.	59,8 кв. м	640/С-59619
Здание гаражей	49,5 кв. м	640/С-60236

***Сведения о земельном участке**:* пл. **0,7113** га предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 24.05.2030) для содержание и обслуживание зданий и сооружений

Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 202 080,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Лот № 1 – 50 % от стоимости предмета аукциона (с учетом ранее внесенного задатка) производится в течение 5 (пяти) календарных дней со дня заключения договора купли продажи, оставшаяся сумма оплачивается с рассрочкой платежа на срок до 6 месяцев.
Лот № 2 – оплата предмета аукциона (с учетом ранее внесенного задатка) производится в течение 5 (пяти) календарных дня с момента подписания договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 1,5 (полтора) процента от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 06.11.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 22.12.2021 в 11.00. Окончание торгов: 22.12.2021 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 21.12.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего ООО «Юрстайл групп»
(220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1404)
ПРОВОДИТ в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) на основании определения Экономического суда Минской области от 24.11.2021 **по делу №** 290-17Б/2019
ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ДУП «Передвижная механизированная колонна № 185» УП «Минскоблсельстрой»
(222410, Минская область, г. Вилейка, ул.Чапаева, 50, УНП 690018995)
в составе:

ЛОТ № 1: здание административно-хозяйственное (административное здание) *(составные части и принадлежности: забор, покрытие)*, **инв. № 631/С-13842, общей площадью 673 кв. м;**
- здание специализированное автомобильного транспорта (гараж) *(составные части и принадлежности: пристройка, туалет)*, **инв. № 631/С-13843, общей площадью 563,4 кв. м;**
- здание неустановленного назначения (подстанция) *(составные части и принадлежности: электрические сети)*, **инв. № 631/С-13844, общей площадью 40,1 кв. м;**
- склад для хранения цемента, инв. № 631/С-62448, общей площадью 162,4 кв. м;
- сторожевая, инв. № 631/С-62453, общей площадью 11,5 кв. м;
- электромеханическая мастерская, инв. № 631/С-62454, общей площадью 316 кв. м;
- склад, инв. № 631/С-63015, общей площадью 581 кв. м;
- гараж, инв. № 631/С-63016, общей площадью 81,8 кв. м;
- столярный цех, инв. № 631/С-63017, общей площадью 170,3 кв. м;
- здание по ремонту двигателей, инв. № 631/С-62455, общей площадью 264,8 кв. м;
- склад для хранения изношенных шин, инв. № 631/С-62449, общей площадью 28,6 кв. м;
- склад для хранения отработанных масел, инв. № 631/С-62452, общей площадью 15,5 кв. м.
Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 621350100007002007 площадью 4,2852 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул. 1 Мая, 108А.
Начальная цена без НДС – **458 800,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **45 880,00** бел. руб.).

ЛОТ № 2: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад кирпичный) *(составные части и принадлежности: пристройка)*, **инв. № 631/С-13998, общей площадью 759,6 кв. м.** *Объект находится в залоге ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк» по договору об ипотеке.*
- здание неустановленного назначения – здание компрессорной *(составные части и принадлежности: пристройка)*, **инв. № 631/С-14022, общей площадью 93,7 кв. м;**
- здание неустановленного назначения – здание растворно-бетонного узла *(составные части и принадлежности: пристройка)*, **инв. № 631/С-14023, общей площадью 482,6 кв. м.** *Объект находится в залоге ЧУП «АСБ Лизинг» по договору ипотеке.*
- разгрузочно-погрузочная эстакада с кран-балкой *(составные части и принадлежности: опора разгрузочно-погрузочной эстакады)*, **инв. № 631/С-65294, общей площадью 0 кв. м;**
- навес для производственных нужд, инв. № 631/С-65295, общей площадью 242,2 кв. м;
- навес для производственных нужд, инв. № 631/С-65296, общей площадью 251,8 кв. м;
- проходная *(составные части и принадлежности: склад, 2 (два) покрытия, 2 (две) площадки, ограждение, пожарный резервуар)*, **инв. № 631/С-66889, общей площадью 12,3 кв. м.**
Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 621350100007002013 площадью 2,4357 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул. Посёлок Чапаева, 50.
Начальная цена без НДС – **318 900,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **31 890,00** бел. руб.).
Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.
Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение, в размере 4 (четырех) процентов от цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на публикацию.
При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.
Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов.
Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до даты их проведения.
Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется Законом Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

Аукцион состоится **05.01.2022 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.01.2022** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефон для осмотра: (8029) 685 36 77.

УНП 690018995

Утерянные представительством Белгосстраха по Первомайскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию наземных транспортных средств формы 2РН/2РП серии ТСН № 0233036, 0212525. «Добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» серии БЛБ №00665402, БЛБ № 1041503, **считать недействительными.**

УНП 100122726

Нясумны дыялог

Смак «Літаратурнага шакаладу»

Як цікавыя праекты папулярызуюць бібліятэку

Надзея Міхайлаўна Саладуха — загадчыца сталічнай бібліятэкі-філіяла № 2 імя Н. К. Крупскай, натура творчая і поўная ідэй. Яна пераможца конкурсу «Мінскі майстар — 2017». Пакарыла журы і гледачоў сваёй арыгінальнай творчай задумай пад назвай «Літаратурны шакалад»: стварыла абгорткі шакаладу, прысвечаныя беларускім пісьменнікам-класікам. А яшчэ размясціла на іх QR-код, які адсылаў на афіцыйны сайт Цэнтралізаванай сістэмы дзяржаўных публічных бібліятэк (ЦСДПб) г. Мінска. Так прыцягвала ўвагу не толькі да бібліятэчнай сістэмы, але і да літаратуры. Пра крэатыў у прафесіі — наша гутарка.

— Надзея Міхайлаўна, як нарадзілася ідэя літаратурнага шакаладу?

— Усё пачалося з конкурсу «Бібліятэкар года», які праводзіўся сярод бібліятэкараў ЦСДПб г. Мінска. Гэта быў першы конкурс такога маштабу ў маім жыцці. І, безумоўна, не чакала, што займу першае месца і нават атрымаю дыплом пераможцы гарадскога конкурсу прафесійнага майстэрства «Мінскі майстар — 2017». Часу на падрыхтоўку аказалася няшмат. А трэба было прыдумаць візітоўку, падрыхтаваць рацыянальную інавацыйную задуму (адзін з этапаў конкурсу меў назву «БРІЗ» — «Бюро рацыянальных інавацыйных задум»). Незадоўга да гэтага віншавала з днём нараджэння сяброўку, і салодкім дадаткам да падарунка стала шакаладка, абгортку якой я афарміла сама. І зусім выпадкова падумала: чаму б не выкарыстаць гэтую ідэю для конкурсу? Адразу прыйшла назва: «Літаратурны шакалад». Потым — аздабленне: партрэты пісьменнікаў, цытаты, мэта праекта і, канешне, рэклама бібліятэкі з дапамогай QR-кода, выкарыстанне якога на той час было яшчэ не вельмі распаўсюджаным. Магчыма, ужо тады гэта была спроба папулярызаваць сайт ЦСДПб г. Мінска сярод карыстальнікаў. Аднак, на жаль, «Літаратурны шакалад» застаўся толькі конкурснай ідэяй. Таму што на той час ажыццявіць яе здавалася нерэальным, ды і ўсур'ёз не ўспрымалася. Вось у гэтым, відаць, і ёсць самая вялікая складанасць у рэалізацыі ўсяго новага: у няўпэўненасці і сумненнях у канчатковым выніку.

— Ды няўжо так лёгка здаліся?

— Вельмі не хацелася адмаўляцца ад мары. Дайшла нават да Мінскага аддзялення гандлёва-прамысловай палаты, дзе юрысты прапанавалі запатэнтаваць маю ідэю як карысную мадэль. Але з-за некаторых абставін гэтага не зрабіла. А калі б нават усё атрымалася і «Літаратурны шакалад» з'явіўся б у продажы, няёмка было ад думкі: шакалад з'ядуць, а абгортку з выявай пісьменніка... выкінуць? Нельга. Таму і спынілася.

— Чаму ж выкінуць? Можна ў закладку, напрыклад, ператварыць!

— Цікавая прапанова! Калі наведвала Санкт-Пецярбург, у кніжнай краме бачыла шмат рознай прадукцыі з выявамі класікаў рускай літаратуры. Відаць, там ставяцца крыху прасцей да «будучыні» такіх абгортак і ўпаковак.

Ды паколькі жыццё не стаіць на месцы і новая рэальнасць патрабуе ад кожнага рухацца далей, нараджаюцца новыя ідэі. Пачала ствараць цыкл віртуальных кніжак-прэзентацый па казках беларускіх пісьменнікаў-класікаў пад агульнай назвай «Куфэрак беларускіх казак». Зрабіла ўжо тры. Абавязкова будзе працяг, ёсць задумкі, як развіць і палепшыць пачатае. Хочацца прыцягнуць увагу маленькіх чытачоў і іх бацькоў да беларускай літаратуры, заахвоціць чытаннем на роднай мове. Як бачыце, мэта першага праекта — папулярызаваць беларускую кнігу і беларускіх аўтараў — засталася нязменнай, і я па-ранейшаму лічу яе вельмі важнай.



«Літаратурны шакалад».

— Гэтаму дапамагае і ваша супрацоўніцтва з Саюзам пісьменнікаў Беларусі?

— На мой погляд, СПБ і бібліятэкі — гэта дзве паловы аднаго цэлага, раз'яднаць якія проста немагчыма. І мэты нашай дзейнасці пераклікаюцца, у многім супадаюць і дапаўняюць адна адну. Разам мы знаёмім чытача з кнігай і аўтарам, адзначаем даты літаратурнага календара, імкнёмся прыцягнуць увагу да найлепшых узораў айчыннага слова. Разам праводзім мерапрыемствы. Колькі цікавых сустрэч з пісьменнікамі адбылося ў бібліятэцы! І для дзіцячай аўдыторыі, і для дарослай. Мы плённа працуем са школамі, якія знаходзяцца побач, запрашаем класы на сустрэчы з аўтарамі. Неаднаразова заўважалася, што пасля знаёмства чытачоў з аўтарам яго кнігі набываюць большую папулярнасць і на паліцах знайсці іх ужо складаней.

— Можа, з кімсьці з пісьменнікаў у вас склаліся асабліва цёплыя адносіны?

— На сустрэчы з чытачамі да нас прыходзілі многія пісьменнікі. І каб нікога не пакрыўдзіць, назаву тых, каго запрашалі неаднойчы. Гэта Уладзімір Ліпскі, Кацярына Хадасевіч-Лісавая, Анатоль Зэкаў, Сяргей Трахімёнак, Уладзімір Мазго, Васіль Шырко, Міхась Пазнякоў, Яна Явіч, Маргарыта Латышкевіч, Надзея Бука, Павел Гушынец, Дзмітрый Юртаеў, Серж Мінскевіч...

— У Дзень бібліятэк у сталічным Купалаўскім тэатры Саюз пісьменнікаў Беларусі ўзнагародзіў вас сярод іншых калег ЦСДПб г. Мінска. Гэта дадатковы стымул для творчасці?

— Безумоўна, заўсёды прыемна атрымліваць узнагароды. І падзяка ад Саюза пісьменнікаў для мяне вельмі каштоўная. Таму што бібліятэка не можа існаваць без тых, хто стварае кнігу для чытача, хто сваімі творамі імкнецца данесці нешта новае, цікавае, нязведанае, хто размаўляе з намі вуснамі сваіх герояў, накіроўвае, выхоўвае і вучыць. Бібліятэкар у сваю чаргу праз сустрэчы з аўтарамі, прэзентацыі, выстаўкі, літаратурныя гасцёўні прыцягвае ўвагу наведвальнікаў да кнігі. Калі ж мяне як загадчыцу бібліятэкі адзначылі падзякай, мяркую, разам з калегамі мы рухаемся ў правільным кірунку.

— Ці ёсць у вас запаветная мара, датычная бібліятэкі?

— Мне хацелася б, каб бібліятэка станавілася ўсё больш неабходнай грамадству, каб паспявала за хуткімі зменамі ў жыцці і сама была здольнай мяняцца і перабудоўвацца, адгукаючыся на патрабаванні часу. Каб кожная бібліятэка была тэхнічна абсталяваная, кніжныя фонды павялічваліся, каб працавалі тут не проста спецыялісты, а творчыя людзі, адданыя прафесіі. І тады, упэўнена, нават самы патрабавальны чытач, які прыйдзе ў бібліятэку, зможа задаволіць любы свой запыт.

— Ідэальныя ўмовы для ідэальнага чытача?..

— З ідэаламі, на мой погляд, увогуле ў жыцці складана. Але калі не надта паглыбляцца ў разважанні, то ідэальным назвала б чытача, які, па-першае, не можа ўявіць вечара без некалькіх старонак кнігі, а па-другое, канешне, ведае, дзе знаходзіцца найбліжэйшая да яго бібліятэка і рэгулярна яе наведвае.

Мы, напрыклад, маем статус бібліятэкі сямейнага чытання. Ёсць дарослы абанемент, а таксама дзіцячы. І многія чытачы прыходзяць сем'ямі. Таты, мамы, бабулі і дзядулі прыводзяць дзяцей і ўнукаў. Таму і кніжны фонд арганізаваны так, каб задаволіць рознаўзроставыя патрэбы. Фонд пастаянна абнаўляецца. Старанна сочым за навінкамі.

Калісьці ў нас быў жывы куток з канарэйкамі, папугаямі, марскімі свінкамі. А зараз застаўся адзін папугай карэла, якому больш за 20 гадоў. Ён ужо дрэнна сябе адчувае, таму даглядаю яго дома. А дзецям і дарослым нашым чытачам паказваю відэа з Гошам, каб не сумавалі па ім і не хвалявaліся.

— У наступным годзе ваша бібліятэка адзначыць 110-годдзе з дня заснавання. Чаму б не адзначыць гэта «Літаратурным шакаладам» і не зрабіць яго візітоўкай бібліятэкі?

— Можна і паспрабаваць. Але ў бібліятэкі няма магчымасці наладзіць вытворчасць шакаладу, таму без аднадумцы-партнёра нічога не атрымаецца. А супрацоўніцтва ў гэтым кірунку, на мой погляд, было б узаемавыгадным. Лічу, што ідэя стварэння «Літаратурнага шакаладу» мае права на жыццё і аднойчы здзейсніцца. Бо мэта маёй задумы будзе актуальнай заўсёды: *«Хай ляціць беларускае слова, // Вольна, звонка гучыць на ўвесь свет! // Наша родная матчына мова — // Слынных творцаў святы запавет»*.

Гутарыла Наталля СВЯТЛОВА, фота аўтара.

Поўную версію інтэрв'ю чытайце на сайце zviazda.by

Шануй сваё!

ТКАНЫЯ ГІСТОРЫІ

У Віцебску праходзіць выстаўка самабытных габеленаў з Верхнядзвіншчыны

Выстаўка габеленаў «Тканыя гісторыі» адкрылася ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці ў першы дзень зімы. Наведаць яе можна да 12 снежня.

Кацярына ЖАЛЮК і Андрэй СКРЫПКА праводзяць майстар-клас па вырабе габеленаў для наведвальнікаў выстаўкі.

Стары млын, беласнежны храм, букет бэзу на стале вясковай хаты — кожная тканая карціна выпраменьвае цеплыню, у кожнай адчуваецца любоў да роднага краю. Усяго на выстаўцы прадстаўлена больш за 40 габеленаў. Выканалі іх сем таленавітых майстроў з розных куткоў Верхнядзвінскага раёна. Двое з іх на адкрыцці выстаўкі не толькі расказалі пра свае работы, але і правялі майстар-клас па вырабе габеленаў для ўсіх наведвальнікаў.

— Мы ў раёне развіваем 16 кірункаў народных рамёстваў, — распавяла **дырэктар Верхнядзвінскага раённага Дома рамёстваў Святлана МАЛАХОЎСКАЯ.** — Сярод іх — саломапляценне, спіральнае пляценне, наіўны (інсітны) жывапіс, выцінанка... Візіткай жа Верхнядзвіншчыны з'яўляецца ткацтва на кроснах. Акрамя таго, наш раён славіцца самабытнымі габеленамі. Іх у нашым фондзе налічваецца каля 50 — гэта больш, чым у іншых раёнах вобласці.

Майстры Верхнядзвінскага краю адрозніваюцца тым, што не баяцца эксперыментаў. Выкарыстоўваюць розныя тэхнікі ткацтва, розныя прыёмы пляцення.

— Ганарымся, што нашы ўмельцы валодаюць не толькі чатырохніцовым ткацтвам, якое распаўсюджана ў Беларусі, але і больш рэдкім шасцінітовым, — адзначае Святлана Малахоўская. — Таксама актыўна адраджаем ткацтва паясоў на дошчачках і на бердзечку. Нядаўна рэканструявалі два паясы на бердзечку Асвейскага краю. Работы нашых майстроў не пакідаюць нікога абыякавымі, атрымліваюць найвышэйшыя адзнакі прафесіяналаў. Чатыры гады таму народны касцюм з традыцыйнымі арнаментамі раёна, сатканы верхнядзвінскімі ўмельцамі, заняў першае месца ў вобласці.

Пры Доме рамёстваў вось ужо тры гады працуе гурток па мастацкім ткацтве пад кіраўніцтвам Валянціны Шумскай. Адзін з яе таленавітых выхаванцаў — 25-гадовы Андрэй Скрыпка. Малады чалавек наведвае дзённае аддзяленне знаходжання для інвалідаў Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Ён, дарэчы, таксама ездзіў на адкрыццё выстаўкі габеленаў у Віцебск, удзельнічаў у майстар-класе, распавядаў, як яго натхняе ткацтва.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Зорны Х-фактар Марыі Купрыяновіч

Марыя Іосіфаўна — салістка адразу некалькі магілёўскіх мастацкіх калектываў, збірае аншлагі на сваіх канцэртах, прыхільнікі яе творчасці дораць любімай артыстцы букеты і нават вершы. Вопыт работы на сцэне ў яе вялікі — болей чым 64 гады! А нядаўна магіляўчку ўбачылі ў модным сёння беларускім тэлепраекце «Х-фактар». Сваёй «Блакітнай хустачкай» яна расчуліла Вольгу Бузаву, натхніла Руслана Аляхно і пакарыла нават Сяргея Саседава. Як вы зразумелі, размова пра журы гэтага конкурсу, зорак беларускай і расійскай эстрады.

Сёмы выпуск шоу «Х-фактар» у Беларусі, дзе ўдзельнічае наша зямлячка, можна ўбачыць на YouTube. Прыгожая, у чырвонай сукенцы і такога ж колеру капелюшы, Марыя Купрыяновіч выглядае чароўна. Нягледзячы на свае 74 гады.

— Усе гавораць, што ў мяне голас незвычайны, — расказвала яна пра сябе ў студыі моднага праекта перад пачаткам выступлення. — Пра мяне нават у энцыклапедыі напісана. А яшчэ ёсць 10 медалёў, пра некаторыя з якіх вы нават і не чулі...

Сукенкі і кашулі яна прыдумвае спецыяльна пад музычны твор. У калекцыі ўжо 20 такіх строяў. У рабоце яшчэ адзін — бэзавы. У ім яна будзе зіхацець (у прамым сэнсе слова, бо тканіна пад луску) на сваім двайным юбілеі (75 гадоў з дня нараджэння і 65 — канцэртнай творчасці) 26 студзеня.

Аб упартым і мэтанакіраваным характары Марыі Іосіфаўны краіна даведалася па яе ж расповедах. На здымкі ў Мінск яе прывезлі на інвалідным вазку. За некалькі месяцаў да здымак яна ўпала ў яму і зламала абедзве нагі. Напэўна, так яе выпрабоўваў лёс. Але гэта не спыніла. Да сцэны кінастудыі яе давезлі на вазку, але каля мікрафона яна ўстала на ногі і павіталa журы.

Яны глядзелі на яе ва ўсе вочы і засыпалі пытаннямі. Пра хваробы, з якімі яна спраўляецца самастойна, пра касцюм, які, як высветлілася, яна сама і пашыла. Марыя Іосіфаўна таксама ў кішэню за словам не лезла. Той жа Бузавай на яе камплiменты адказала, што таксама рада была яе ўбачыць. «Вы ўся ў мяне», — апякунскім тонам сказала яна. Бузава была агаломшаная і прызналася, што таксама хацела б спяваць у 74 гады і шыць капялюшыкі.

Пра выступленне магіляўчанкі рускі і ўкраінскі музычны крытык Сяргей Саседаў сказаў: «Марыя Іосіфаўна, вы сама — Х-фактар. Ваша жыццё і лёс — цалкам Х-фактар. І наш у параўнанні з ім — адна сотая або адна тысячная частка. Вы — узор для тых, хто будзе выходзіць на сцэну, мэтр свайго лёсу. Выдатна спяваеце. Хто пачуе, як вы выконваеце, хай раўняюцца на вас».

Марыя Іосіфаўна сапраўды незвычайная. Не сядзіць у чатырох сценах і не скардзіцца на лёс. Ён быў не заўсёды літасцівы да яе, але яна нават і выгляду не падае. На сустрэчу з карэспандэнтам «Звязды» прыйшла як і на здымкі — элегантна апранутая — хоць зараз на сцэну — і з цэлым пакетам фотаздымкаў і публікацый: напэўна, ні адно сур'ёзнае культурнае мерапрыемства ў вобласці не абыходзіцца без яе лірычных рамансаў і аперэтачных арый. Яна, здаецца, свеціцца знутры, а ў спалучэнні са сваім запальчывым голасам зараджае пазітывам з паўабароту.

— У «Х-фактар» я прыйшла не дзеля таго, каб пабудаваць сваю пеўчую кар'еру, — прызнаецца. — Мне хапае прыхільнікаў і без гэтага. Проста заўсёды цікава паспрабаваць нешта новае. Таму, калі кіраўніца студыі класічнага вакалу, якую я наведваю, паведаміла пра кастынг, не раздумваючы, пайшла. Дастаткова было і адной песні, але я праспявала шэсць — тры рамансы, дзве ваенныя і песню «Адліга», якую спяваю 25 гадоў «на фантанах» у магілёўскім скверы 40 гадоў Перамогі.

Напэўна, дзякуючы ўпартасці і невычэрпнаму жыццялюбству, жыццё Марыі Іосіфаўны ніколі не было сумным. З 10 гадоў спявала ў дзіцячым хоры пры Палацы культуры Магілёўскага завода штучнага валакна. Назва гэтага хору занесена ў энцыклапедыю Магілёва. Марыя Купрыяновіч у 13 гадоў стала лаўрэатам конкурсу за выкананне песні «Данка» на музыку Ёганеса Брамса.

Калі Марыя Іосіфаўна расказвае пра фестывалі і конкурсы, у якіх удзельнічала, хутка збіваешся з ліку. Запамінальных выступленняў было столькі, што можна кнігу пісаць. Жанчыне прысвячалі вершы, дарылі кветкі і сэрцы. На адным з юбілейных канцэртаў уручылі аж 42 букеты. Здараліся цікавыя сустрэчы з вядомымі людзьмі. Падчас выступлення на турбазе ў горадзе Сочы да яе падышла знакамітая актрыса Людміла Хіцяева. Яна паціснула спявачцы з Магілёва руку і пазайздросціла: «Ну і голас у цябе, дзяўчынка!» Пасля гэтага Марыя Іосіфаўна яшчэ не раз сустракалася з Хіцяевай, і тая заўсёды захапляецца яе голасам.

Успамінае, што зала падпявала ёй стоячы.

— Я стараюся спяваць так, каб людзям гэта падабалася, — дзеліцца сакрэтам поспеху. — Знаёмыя кажуць, што нават калі б не было чуваць майго голасу, зразумелі б, што я спяваю, па маіх руках.

На «Х-фактар» Марыя Іосіфаўна прыхапіла з сабой і ўзнагароды — працоўныя і «песенныя». Асабліва ўразіла журы «медаль» за ўдзел у конкурсе «Дзе-Рыбас — Адэса маці, Дзе-Рыбас — Адэса тата».

— Гэта было ў 1976 годзе, — усміхаецца яна. — Мы з сяброўкамі адпачывалі на моры і вырашылі наведаць буцікі на вялікім прагулачным цеплаходзе «Россия». Але, калі я прачытала, што там праводзіцца песенны конкурс, мне было ўжо не да буцікоў. Сказала дзяўчатам, што жадаю стаць пераможцам гэтага конкурсу. Так і атрымалася. Праспявала куплеты з 10 песень, кожны з якіх пачынаўся з апошняй літары папярэдняга. Калі публіка пачула пра «шаланды поўныя кефалі», узарвалася ў захапленні. Першае месца было за мной.

Гэты медаль ёй дарагі яшчэ і тым, што той цеплаход «Россия», на якім яна спявала, як высветлілася, вельмі пацярпеў падчас вайны. Немцы яго захапілі, але ў 1950-я гады былы танкер вярнулі ў Савецкі Саюз. Ён быў увесь абстраляны кулямі і снарадамі. Яго адрамантавалі і зрабілі прагулачным. І наперакор усім няшчасцям ён яшчэ пэўны час вазіў адпачывальнікаў.

— «На сцэне каралева, уборы хоць куды...» — дэкламуе Марыя Іосіфаўна прысвечаныя ёй радкі ад кранутых яе рамансамі прыхільнікаў.

Канцэртныя сукенкі — асобная нагода для размовы. Чырвоная з празрыстымі рукавамі і ўпрыгожаная ракавінкамі скарыла Бузаву. Яна спытала, дзе Марыя Іосіфаўна заказвала ўбор. Тая сціпла адказала, што пашыла сама за тыдзень. Не стала дадаваць, што яшчэ і ночы прыходзілася шчыраваць, бо касцюм складаны, ды яшчэ з капелюшом. А шые спявачка ўручную, швейная машынка некалькі гадоў як зламалася. Сукенкі і кашулі яна прыдумвае спецыяльна пад музычны твор. У калекцыі ўжо 20 такіх строяў. У рабоце яшчэ адзін — бэзавы. У ім яна будзе зіхацець (у прамым сэнсе слова, бо тканіна пад луску) на сваім двайным юбілеі (75 гадоў з дня нараджэння і 65 — канцэртнай творчасці) 26 студзеня. Прывычка шыць засталася са школьных урокаў па працоўным навучанні. Яе і тады настаўніца ацэньвала вышэйшым балам за старанне, бо ў адрозненне ад аднакласніц, якім маці страчылі нарады на швейных машынках, яна рабіла іх пры дапамозе выключна іголкі і ніткі.

— На юбілейным канцэрце буду спяваць «Карамбаліну» і песню, якую прадставіў Баскаў на свой юбілей, — «Прывід оперы». Памятаеце? «В мой разум призрак оперы проник, он мой двойник...» Баскаў праспяваў. Чаму я не магу на сваім юбілеі выканаць? — дзеліцца планамі суразмоўніца.

Любоў да песні ў Марыі Іосіфаўны спадчынная. Бацька спяваў, а яго брат Пётр іграў на гармоніку. Яны і ваявалі разам, Пётр загінуў. Маці Марыі Іосіфаўны цудоўна спявала прыпеўкі. Дачка занатавала пад сотню яе песень. На жаль, нататнік згубіўся. Любоў да песні перадалася і дзецям. Бацька быў ваенным, і сям'я пераязджала з месца на месца. Некалькі гадоў таму Марыя Іосіфаўна пазнаёмілася са сваім акампаніятарам, таксама былым ваенным Валерыем Кантроўскім. Высветлілася, што ён праходзіў службу на поўначы, у горадзе Пячоры, дзе пабраліся шлюбам бацькі Марыі Іосіфаўны і дзе яна нарадзілася. Былы падпалкоўнік самавучка, іграе на акардэоне выключна рамансы. Таму яны і сталі выступаць разам. Сёння іх можна пачуць на канцэртах у ДК чыгуначнікаў, іх шмат запрашаюць на творчыя вечары ў санаторыі і бібліятэкі.

Калі Марыя Іосіфаўна расказвае пра фестывалі і конкурсы, у якіх удзельнічала, хутка збіваешся з ліку. Запамінальных выступленняў было столькі, што можна кнігу пісаць. Жанчыне прысвячалі вершы, дарылі кветкі і сэрцы. На адным з юбілейных канцэртаў уручылі аж 42 букеты.

Голас Марыі Іосіфаўны ведаюць прыхільнікі танцаў пад духавы аркестр «на фантанах» у скверы 40 гадоў Перамогі Магілёва. З 1995 года тут кожнае лета па нядзелях вальсуюць пад духавы аркестр аматары рэтрамелодый. Марыя Іосіфаўна прыйшла туды аднойчы і таксама захапілася.

— У мяне тады памерла маці, я замкнулася ў сабе, сядзела дома. І сяброўка паклікала на фантаны, каб крыху магла развеяцца, — дзеліцца яна гісторыяй 25-гадовай даўніны. — Прыйшлі, а там я пазнала ў вядучай сваю аднакласніцу Вольгу Руцкую. Яна прапанавала праспяваць пад духавы аркестр, і я рызыкнула. Выканала «Ты чуеш песню сэрца майго» і танга «Каханаю». Дагэтуль іх спяваю.

Марыя Іосіфаўна — натура вельмі аптымістычная і творчая. Нездарма ў яе руках ажывае нават сухое дрэва. Напрыканцы яна ўспомніла калядную гісторыю пра тое, як 25 гадоў таму, калі працавала ў дзіцячым садку, зрабіла сувенір з сухога дрэва, пакрыла яго лакам, а напярэдадні Раства на ім з'явіліся тры вешанкі. Вось і не вер пасля гэтага ў прымаўку, што ў руках творцы і камень ажывае.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота аўтара і з калекцыі Марыі КУПРЫЯНОВІЧ.

ВАРАЖБА НА «КРЫПЦЕ»

Чаму з'яўляюцца новыя віртуальныя валюты?

Крыптавалюта Omicron, якая з'явілася ў пачатку ліставада, рэзка падаражэла на фоне навін пра новы штам каранавіруса B.1.1.529, якому САА3 напрыканцы мінулага тыдня прысвоіла аналагічную назву. У мінулую нядзелю Forbes паведаміў пра рост кошту Omicron на 500 працэнтаў. Да панядзелка гэтая «крыпта» пацяжэла амаль на 1000 %. Бясконцыя фінансавыя піраміды, праекты без ідэй і сэнсу, фанацкія токены і, нарэшце, мільярды долараў, укладзеныя ў мемы, — усё гэта рэальнасць крыптарынку, куды прыходзіць усё больш людзей, заўважыла lenta.ru. Такія фінансавыя навіны эксперты часцей называюць азартнай гульнёй, чым магчымасцю надзейных інвестыцый, аднак ні парады, ні відавочныя рызыкі не могуць утрымаць мільёны людзей ад вялізных страт. Чаму з'яўляюцца новыя крыптавалюты?

Усім і нікому

Інвестараў прыцягвае магчымасць гандлю без пасрэднікаў, перш за ўсё банкаў, а таксама дэцэнтралізаваная сістэма захоўвання даных (блокчэйн), якая даступна ўсім, але не належыць нікому. Акрамя таго, у крыптавалютным свеце пануе ананімнасць — трымальнік лічбавых манет не абавязаны прывязваць асабістыя даныя да свайго кашалька, а пры пераводзе дастаткова ўказаць нумары рахункаў адпраўніка і атрымальніка. Цікавасць да новай плацежнай сістэмы выйшла за межы лакальных IT-супольнасцяў пасля поспеху біткоіна (BTC). Упершыню здзелка з «біткамі» была праведзена ў маі 2010-га — амерыканец Ласла Ханеч заказаў дастаўку піцы, заплаціўшы 10 тысяч BTC. Тады Ханеч выдаткаваў каля 40—50 долараў, але зараз купля абышлася б яму ў 630 мільёнаў «зялёных», бо з таго часу попыт на лічбавую валюту стабільна павялічваўся.

Неўзабаве ў стваральніка біткоіна з'явіліся паслядоўнікі, якія захацелі паўтарыць поспех біткоіна. Яны бралі за аснову праграмны код BTC, уносілі мінімальныя змены і атрымлівалі новы, хоць і аналагічны, прадукт. Так з'явіліся альткоіны («альтэрнатыўныя коіны», або любыя лічбавыя грошы, акрамя біткоіна). З часам распрацоўшчыкі альткоінаў сталі ставіць перад сабой новыя задачы, імкнучыся пераадолець тэхнічныя абмежаванні, якія мае сістэма біткоіна. Збольшага ім гэта ўдалося. Цяпер майнінг (стварэнне) любых альткоінаў, як правіла, прасцейшы і таннейшы. Транзакцыі праходзяць хутчэй, а ананімнасць забяспечваецца лепш, чым у сетцы BTC. Акрамя таго, у новых крыптавалютах і звязаных з імі плацежных сістэмах пачалі з'яўляцца дадатковыя функцыі. Напрыклад, другая па капіталізацыі крыптавалюта Ethereum (эфір) дазволіла ствараць дэцэнтралізаваныя дадаткі і смарт-кантракты (калі плацяжы аўтаматычна ажыццяўляюцца з загадзя вызначанымі ўмовамі). Іншая сістэма — IOTA — забяспечыла абароненую перадачу даных у інтэрнэце рэчаў (абмене інфармацыяй паміж прыладамі).

Мем для Маска

Аднак пакуль устойлівыя «гіганты» накшталт біткоіна і эфіру раслі ў кошце, некаторыя распрацоўшчыкі пачалі карыстацца папулярнасцю, якая захапіла крыптавалютны рынак. З'явіліся гульцы, у чые планы не ўваходзіла стварэнне інавацыйных IT-праектаў — у «крыпце» яны перш за ўсё бачылі магчымасць хутка зарабіць. Новыя ўдзельнікі рынку пачалі выкарыстоўваць крыптавалюту не ў якасці грошай, а ў якасці віртуальных акцый. Стваральнікі новых валют разумелі, што іх патэнцыйнымі фундатарамі галоўным чынам з'яўляюцца карыстальнікі інтэрнэту. Таму яны пачалі звязваць свае праекты з мемамі — віральнымі вобразамі або ідэямі.

Некаторыя з «мемных» валют з'яўляюцца не паўнавартаснай «крыптай», а токенамі (манетамі). Выпусціць лічбавую манету можа любы ахвотны, нават не набываючы вылічальнага абсталявання, — паводле даных платформы CoinMarketCap, колькасць мем-токенаў набліжаецца да сямі тысяч. У адрозненне ад крыптавалют, токены могуць эмітавацца адным чалавекам у неабмежаванай колькасці, і падчас іх стварэння блокчэйн задзейнічаць неабавязкова.

Калі мем-токены атрымліваюць вядомасць і даражэюць, то пераважна дзякуючы прасоўванню ў сетцы або рэкламе знакамітасцяў, а не з-за фінансавай эфектыўнасці. Гэтыя праекты недаўгавечныя: як толькі манета даражэе, інвестары прадаюць яе, атрымліваючы прыбытак. З-за адсутнасці якой-небудзь карысці для фінансавага свету мем-токены наўрад ці будуць існаваць ужо праз некалькі гадоў, мяркуюць эксперты.

Самай вядомай і нават адносна ўстойлівай мемнай манетай стаў Dogecoin. Ён быў створаны дзеля жарту на аснове папулярнага мема з сабакам пароды сіба-іну ў 2013 годзе. На дадзены момант адна манета каштуе 0,215 долара, а рыначная капіталізацыя праекта перавысіла 34,9 мільярда долараў. Усё дзякуючы таму, што токен прыцягнуў увагу заснавальніка Tesla Ілана Маска: мільярдэр рэгулярна піша пра яго ў Twitter, а аднойчы нават назваў Dogecoin сваёй любімай крыптавалютай (у гэты дзень курс токена ўзляцеў амаль на чвэрць).

Публікацыі Маска сёлета з лютага да красавіка павысілі кошт альткоіна на 1330 працэнтаў. Пазней бізнесмен лаканічна растлумачыў, чым яму спадабаўся Dogecoin: у яго «ёсць мемы і сабакі, а ў іншых праектаў гэтага няма». На хвалі папулярнасці «доге» пачалі з'яўляцца іншыя манеты з выявай сіба-іну. У рэйтынгу мем-токенаў на сайце CoinMarketCap у першую трыццатку цяпер уваходзяць дзевяць аналагаў Dogecoin. Самым паспяховым з іх на дадзены момант з'яўляецца токен Shiba Inu, які падаражэў у кастрычніку, калі Маск заявіў шчанюка гэтай пароды і апублікаваў яго фатаграфію ў Twitter. Днямі Shiba Inu перамясціўся на 11-ы радок у рэйтынгу на сайце CoinGecko, а агульны кошт усіх манет складае 22,4 мільярда долараў.

На прасторах CoinMarketCap можна выявіць мноства манет, створаных дзеля жарту. Напрыклад, Jesus Coin, за куплю якога распрацоўшчыкі абяцалі месца ў раі. Каманда нават вяла перагаворы з некалькімі хрысціянскімі цэрквамі розных напрамкаў, каб атрымаць магчымасць адпускаць грахі за куплю манет. На сайце было пазначана, што стваральнікам токена з'яўляецца Ісус Хрыстос, яго даверанай асобай — Іуда, а рэкламай займаецца апостал Пётр.

Некаторы час з «доге» канкурыравала ў кошце манета з выявай папулярнай мемнай жабы — Pepe Cash. Токен дасягнуў піка кошту ў 0,157 долара 13 студзеня 2018-га, калі Dogecoin каштаваў 0,136 долара. Праект Pepe Cash страціў папулярнасць — кошт упаў на 77,6 працэнта, зараз манета гандлюецца на ўзроўні 0,036 долара, займаючы 754-е месца ў рэйтынгу CoinMarketCap.

Месца ў раі

Укладанні ў мемную валюту вельмі рызыкоўныя і больш падобныя на азартную гульню, чым на сапраўднае інвеставанне. Дырэктар крыптаабменніка Alfacash Мікіта Сошнікаў заўважыў lenta.ru, што цікавасць да такіх токенаў нарастае ў перыяды зацішша ў сектары больш буйных і стабільных крыптавалют, калі трэйдары жадаюць весці больш актыўны гандаль і атрымліваць больш хуткі прыбытак. «Мемныя крыптавалюты даюць магчымасць атрымаць асалоду ад рызыкоўнага трэйдзінгу, такое задавальненне шмат у чым падобнае на азартныя гульні або амерыканскія горкі, і, безумоўна, гэта забаўка на аматара», — растлумачыў ён. Сузаснавальнік платформы ENCRY, якая спецыялізуецца на дэцэнтралізаваных фінансах, Раман Някрасаў згодны з тым, што менавіта коштавыя «арэлі» мемных манет прыцягваюць трэйдараў. На яго думку, спекуляцыя на іх з'яўляецца «вельмі азартнай і займальнай гульнёй», якая дае шанц прымножыць свае актывы. Разам з тым Някрасаў адзначыў, што інвеставаць усе свае зберажэнні ў такія крыптаактывы не варта.

З такімі токенам варта быць асцярожным, паколькі перспектывы іх развіцця амаль немагчыма прадбачыць. «Крыптавалюты-мемы — гэта выдатная дэманстрацыя таго, што актыў каштоўны выключна па прычыне каштоўнасці ў вачах удзельнікаў рынку», — заўважыў эксперт. Як патлумачыў CEO швейцарскай фінансавай кампаніі Newcent Уладзімір Смятанін, ажыятаж з нагоды любога мем-токена могуць выклікаць самыя непрадказальныя і невідавочныя фактары, напрыклад, выказванні медыйных персон.

На прасторах CoinMarketCap можна выявіць мноства манет, створаных дзеля жарту. Напрыклад, Jesus Coin, за куплю якога распрацоўшчыкі абяцалі месца ў раі. Каманда нават вяла перагаворы з некалькімі хрысціянскімі цэрквамі розных напрамкаў, каб атрымаць магчымасць адпускаць грахі за куплю манет. На сайце было пазначана, што стваральнікам токена з'яўляецца Ісус Хрыстос, яго даверанай асобай — Іуда, а рэкламай займаецца апостал Пётр. У 2018-м праекту ўдалося дасягнуць капіталізацыі ў 1,57 мільёна долараў, аднак да цяперашняга часу ён ужо спыніў існаванне.

Сёлета быў анансаваны «самы бескарысны токен» — Useless Token. Яго стваральнікі шчыра заяўляюць аб адсутнасці якой-небудзь карысці ў сваім прадукце, але абяцаюць узбагаціць кліентаў за кошт удалага маркетынгу. «Першы гіпердэфляцыйны токен. Гэты токен настолькі бескарысны, што мы губляем усю выручку, каб выкупіць яго назад, а пазней проста знішчыць», — адзначаецца на сайце праекта. Хвалячыся сваімі дасягненнямі, распрацоўшчыкі паказалі на сайце, што маюць 0 задаволеных кліентаў і 0 узнагарод, а таксама маюць некалькі дзён вопыту, бо «даведаліся, як стварыць вэб-сайт і токен, прагледзеўшы відэа індыйскіх ютуберaў».

Гульня ў «кальмара»

Не ўсе стваральнікі альткоінаў згодны дзяліцца прыбыткам з інвестарамі. На рынку пачалі развівацца так званыя скам-праекты, дзе асноўнымі фундатарамі выступаюць самі арганізатары. У сеткавым бізнесе слова «скам» ужываюць да прадпрыемстваў, якія затрымліваюць ці зусім перастаюць рабіць выплаты, парушаюць умовы супрацоўніцтва і абавязкі перад партнёрамі, кліентамі і фундатарамі. У рускамоўнай супольнасці «скамам» часцей за ўсё называюць інвестыцыйныя хайп-праекты (якія выкарыстоўваюць агрэсіўны маркетынг) і фінансавыя піраміды. Такія кампаніі імкліва развіваюцца і закрываюцца на працягу года, адразу пасля таго, як атрымаюць дастаткова грошай ад інвестараў. Усе падобныя праекты аб'ядноўвае адно: іх заснавальнікі — ашуканцы, якія «выпампоўваюцца» максімальна магчымы аб'ём сродкаў са сваіх кліентаў, а пасля знікаюць. За крыптавалютамі, якія развіваюць па такой стратэгіі, замацавалася назва «шыткоіны» (ад спалучэння слоў 'shit' і 'coin').

У індустрыі лічбавых грошай скамеры звычайна карыстаюцца схемай pump & dump («напампаваць і скінуць»). Яе сэнс заключаецца ў тым, каб прыцягнуць увагу спажыўцоў з дапамогай ілжывых абяцанняў і актыўнай рэкламы, штучна завысіць курс валюты, а пасля прадаць токены на піку кошту і закрыць праект, пакінуўшы ні з чым пакупнікоў. Крыптамахляры актыўна выкарыстоўваюць падтрымку знакамітасцяў. Прасоўваннем токенаў часцей за ўсё займаюцца блогеры і стрымеры з вялікай аўдыторыяй. Яны раяць прыгледзецца да пэўных праектаў ці наўпрост заклікаюць інвеставаць у іх. Некаторыя блогеры дзеляцца рэальным вопытам гандлю токенамі, але часцей за ўсё яны атрымліваюць узнагароду за згадванне лічбавых валют.

Перадпродаж крыптавалюты Squid («кальмар»), створанай па матывах серыяла Netflix «Гульня ў кальмара», пачаўся 20 кастрычніка. Як паведамілі стваральнікі, токены разышліся за адну секунду. На біржы PancakeSwap, дзе ў асноўным вяліся таргі, за адну манету яшчэ 26 кастрычніка давалі 0,012 долара, 28 кастрычніка курс перавысіў адзнаку 2 долара і працягнуў рост у наступныя дні. 1 лістапада кошт Squid узляцеў да 2861 долара, а ўжо праз 10 хвілін пасля піка абрынуўся да нуля. Паспрыяла ашуканцам і жаданне буйных медыя атрымаць трафік на таннай сенсацыі: адпаведныя тэксты з'явіліся на аўтарытэтных BBC, Business Insider, Fortune, CNBC і Yahoo News. Мяркуецца, што стваральнікі «кальмара» зарабілі на афёры больш за 3,3 мільёна долараў.

Былы брокер Джордан Белфорт, які стаў прататыпам галоўнага героя фільма «Воўк з Уол-Стрыт», раскрытыкаваў мемныя крыптавалюты і назваў іх бескарыснымі. У інтэрв'ю The Sun ён заўважыў, што цяпер на рынку з'яўляецца ўсё больш лічбавых актываў, галоўная мэта якіх — разлучыць інвестараў з іх грашыма. Як бачым, прынада дзейнічае.

Захар БУРАК.

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз» (продавец) извещает о проведении 15 декабря 2021 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

№ лота	Наименование имущества	Инв. №	Начальная цена продажи с НДС, бел. руб.	Задаток (10 %) с НДС, бел. руб.
1	Градирня «Росинка-80/100»	119	3 300,00	330,00
2	Градирня «Росинка-80/100»	120	3 300,00	330,00

Продавец: ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз», Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42.
Контактный телефон +375 29 655 50 51.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 13.12.2021 г. в 17.00.

С предметом аукциона можно ознакомиться каждую пятницу по предварительному согласованию с ликвидатором.

